ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ВІЦЕБСКІ ПРАЛЕТАРЫ

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЕТА ГАРКОМУ КП(б)Б, ГАРСАВЕТУ І ГАРПРАФБЮРО.

КОШТ НУМАРУ У ГОРАДЗЕ І АКРУГЕ 5 КАП.

РЭДАКЦЫЯ Савецкая, 22. Тэлеф. агульны 72, „ рэдактара 2-68. „ с-ры 4-75.

Падпісная цана у месяц 90 кап. Плата за абвесткі: За радок петыту . . . . 20 кап. Для ненагародных . . . . 40 кап. Пры шматразовым друкаванні скідка па згодзе.

Год выдання 13-ты.

№ 234 | Серада, 8 кастрычніка 1930 г. | № 234

АПЭРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА З ПАБУДОВЫ ШВЭЙНАЙ ФАБРЫКІ № 1—7-га кастрычніка

Кіраўніцтва пабудовы і пуску швэйнай фабрыкі і парт'ячэйка б'юць трывогу. Асабліва трывожнымі зьяўляюцца наступныя вучасткі, дзе магчыма чакаць прарываў: **кацельная гаспадарка** — патрэбна рабочая брыгада з 15 чалавек, каменшчыкаў. **Саюзтранс** (віцебскае аддзяленьне) з 20 верасьня ня вывозіць з станцыі Віцебск на тэрыторыю пабудовы кацёл, з прычыны чаго затрымліваецца абмураваньне астатніх катлоў; **завод „Камінтэрн“** — затрымлівае выкананьне заказаў швэйбуду; **мантаж трансфарматарскага кіоску й галоўнага разьмяркавальнага шчыта** — марудным тэмпам выконваюцца В. Э. О. і камтрэстам; **трывожна з выкананьнем работ «Дзяржшвэймашыны»**—завод «Чырвоны Мэталіст» сыстэматычна парушае дагавор па дастаўцы трансмісій для ф-кі; **будаўніцтва сталовай Белдзяржбудам** спынена і пры пуске ф-кі рабочыя ня будуць забясьпечаны харчаваньнем; віцебскае аддзяленьне **Белдзяржснаба срывае работу** фармальнымі адносінамі да працы. Кіраўніцтва пабудовы прымае ўсе меры, але патрэбна дапамога з боку адзначаных арганізацый.

Выкананьне сельска-гаспадарчых кампаній — НА СЛУЖБУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ПЕРАБУДОВЫ ВЁСКІ

Пралетарыі гораду, на дапамогу вёсцы па арганізацыі магутнага калгаснага прыліву, па ліквідацыі кулацтва як клясы на аснове суцэльнай калектывізацыі

Пастанова ЦК УсеКП(б) аб дню калектывізацыі і ўраджаю

1. Ураджай 1930 году, перавышаючы ўсе ўраджаі за мінулыя гады, дасягнут, дзякуючы правільнай палітыкі партыі, забясьпечыўшай вялізны рост саўгасаў і калгасаў, унядрэньне трактараў і машын у сельскую гаспадарку, шырокае правядзеньне аграмерапрыемстваў і далейшае ўцягненьне новых мільёнаў беднякоў і серадняковаў у барацьбу за суцэльную калектывізацыю і на гэтай аснове, ліквідацыю кулацтва як клясы.

2. Дзень калектывізацыі і ўраджаю сёлета трэба правесьці пад знакам шырокага ўцягненьня новых мільёнаў бядняцкіх і серадняцкіх гаспадарак у калгасы, пераходу прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў у пасялковыя арцелі, а таксама—усямернага і сапраўднага ўзмацненьня існуючых калгасаў, шляхам масавага агляду і шырокай папулярызацыі дасягненьняў калгасаў, саўгасаў і машынна-трактарных станцый і асьвятленьня перад масамі задач барацьбы супроць маючыхся ў калгасах і саўгасах фактаў недысцыплінаванасьці, расхлябанасьці і г. д. Задачы калгаснага будаўніцтва і яго дасягненьні павінны быць паказаны і растлумачаны шырокім масам беднякоў і серадняковаў-аднаасобнікаў, яшчэ не ўвайшоўшых у калгасы, з тым, каб на гэтых дасягненьнях яны ясна ўбачылі ўсе перавагі калгаснае гаспадаркі.

3. У гэтых мэтах арганізоўваць справаздачныя сходы ўсіх калгасьнікаў аб выніках году з шырокім прыцягненьнем на гэтыя сходы беднякоў і серадняковаў адзінаасобнікаў, дакляды калгасьнікаў аб выніках году на сельскіх сходах беднякоў і серадняковаў, як у сваіх, так і ў суседніх вёсках, выстаўкі дасягненьняў калгасьнікаў і г. д. Адначасова «дзень калектывізацыі і ўраджаю» неабходна скарыстаць для ўсямернага ўмацаваньня сувязі гарадзкіх рабочых і работніц з калгасьнікамі і бядняцка-серадняцкімі масамі ў самых разнастайных формах (мясцовыя вытворчыя канфэрэнцыі прадпрыемстваў і калгасаў, праверка дагавораў па шэфству і заключэньне новых, пасылка пралетарскіх дэлегацый у калгасы і саўгасы і калгасных на прадпрыемствы і інш.) Разам з тым павінна быць падхоплена ініцыятыва сельска-гаспадарчых рабочых, калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас на складаньне сустрэчнага пляну сельска-гаспадарчай вытворчасьці і мабілізаваць самадзейнасьць калгасьнікаў шляхам сацспаборніцтва і ўдарніцтва на барацьбу са скажэньнямі і недахопамі калгаснага будаўніцтва.

4. Вытварыць праверку выкананьня калгасамі і аднаасобнікамі хлебанарыхтоўчага пляну і мабілізаваць калгасьнікаў і аднаасобнікаў—беднякоў і серадняковаў на хутчэйшае выкананьне хлебанарыхтовак і палепшаньне снабжэньня пралетарскіх раёнаў, на выкананьне ў тэрмін уборкі, малацьбы і зяблевай успашкі. Пры гэтым асаблівая ўвага павінна быць аддадзена мабілізацыі актыўнасьці і самадзейнасьці калгасных, бядняцка-серадняцкіх мас сялянак. Дэлегацкія сходы жанчын, клюбы, чырвоныя куткі, масавыя канфэрэнцыі сялянак павінны стаць ініцыятарамі і арганізатарамі чырвоных абозаў, ударных брыгад па выкананьню хлебанарыхтоўчага пляну, кантрактацыі сьвёклы, ільну, снабжэньня рабочых раёнаў гароднінай, малаком, а таксама застрэльшчыкамі арганізацыі новых калгасаў і вытворча-каапэрацыйных аб'яднаньняў.

5. ЦК прапануе ўсім партыйным, прафэсыйным, камсамольскім, калгасна-каапэрацыным і савецкім арганізацыям забясьпечыць сапраўдна-масавы характар «дня калектывізацыі і ўраджаю». Добра падрыхтаваць мерапрыемствы, якія неабходна правесьці для ўзмацненьня калгасаў і ўцягненьня новых мільёнаў беднякоў і серадняковаў у калгасы, рашуча змагаючыся з правай і «левай» апартуністычнай практыкай у калгасным будаўніцтве, проці стаўкі на самацёк, замкнёнасьці калгасаў, недаацэнкі актыўнасьці кулака, паслабленьня адпору контрэвалюцыйнай, шкоднікай работе кулацтва, а таксама проці стаўкі праяўленьня камандваньня і антысерадняцкіх скрыўленьняў у справе разгортваньня калгаснага будаўніцтва.

«Дзень калектывізацыі і ўраджаю» правесьці з 15-га па 25-га кастрычніка.

Усім райкомам КП(б)Б

Тэлеграма ЦК КП(б)Б

ЦК РСІ, Наркамзем БССР, Белкалгасцэнтр разам з рэдакцыямі газэт: «Зьвязда» і «Социалистическое Земледелие» арганізуюць генэральную праверку выкананьня гаспадарчых задач восеннага пэрыяду.

Мэты праверкі—поўная ліквідацыя прарываў ва ўборцы, сяўбе, будаўніцтве, жывёлагадоўлі і хлеба і бульбазагатоўках.

Праверка павінна быць падпарадкавана асноўнай задачы арганізацыі калгаснага прыліву.

ЦК КП(б)Б абавязвае райкомы забясьпечыць актыўны ўдзел партарганізацый, камсамолу, прафсаюзаў, калгасаў і саўгасаў у праверцы. Праверка праходзіць з 6-га па 16-га кастрычніка. Неадкладна ствараюцца раённыя штабы пад кіраўніцтвам сэкратароў РК.

Падрабязнасьці ў «Зьвязьдзе» і «Социалистическом Земледелии» ад 6-га кастрычніка.

Сэкратар ЦК Гей.

Усю энэргію, усе сілы грамадзкасьці — на бульбазагатоўкі

Тэлеграма ЦК КП(б)Б і СНК

Ня гледзячы на дырэктывы аб наданьні справе загатовак і адгрузкі бульбы ўдарных тэмпаў, да гэтага часу загатоўкі ідуць злачынна марудна. Пляны загатовак бульбы ў верасьні выкананы ўвельмі нязначным процанце. Нарады на вываз ня выкананы.

На працягу кастрычніка ў асноўныя прамысловыя цэнтры Саюзу павінна быць вывезена 160 тыс. тон бульбы. Гэта патрабуе напружанасьці ўлады і усёй грамадзкасьці. Кожны дзень з Беларусі павінна адгружацца 400 вагонаў бульбы. Аднак, месцы ня здолелі прыцягнуць членаў партыі, членаў прафсаюзаў, бядняцка-серадняцкія масы, жонак рабочых і служачых на дапамогу ўборцы бульбы.

Загатоўчыя арганізацыі бязьдзейнічаюць, чакаюць самацёку.

Такія адносіны гаворыць аб самай шкоднай недаацэнцы задачы і пагражаюць зрывам выкананьня плянаў загатоўкі і вывазу.

Зараз-жа ўсёй справе бульбазагатовак і адгрузкі павінны быць наданы рашучыя, сапраўды баявыя тэмпы.

Пад асабістую адказнасьць сакратароў райкомаў, старшынь райвыканкомаў трэба ўжыць наступныя меры: зараз-жа зьвязацца з усімі калгасамі і саўгасамі, выявіць патрэбную рабочую сілу, мабілізаваць масы і кінуць іх на дапамогу капаньню бульбы.

Кулацкім гаспадаркам павінны быць даны кароткія тэрміны здачы бульбы дзяржаве. Трэба прыняць рашучыя меры супроць тых, хто не здае бульбы.

Нездольныя працаваць у загатоўчых арганізацыях павінны быць зьняты з работы і заменены больш здольнымі работнікамі. Трэба ўзмацніць загатоўчыя арганізацыі да канца кампаніі новымі сіламі. Трэба мабілізаваць адказных работнікаў і накіраваць іх у калгасы і саўгасы для арганізацыі справы на месцы.

Укараніць у рабоце па загатоўках і адгрузцы бульбы мэтады ўдарніцтва і спаборніцтва, арганізацыі чырвоных абозаў.

Побач з выкананьнем нарадаў на вываз, неабходна ўжыць усе захады па вызначэньні зон для прамысловасьці, для бесперабойнай загрузкі заводаў бульбай. Трэба пакласьці канец тэндэнцыям месц зьнішчыць загатоўчыя пляны.

Данныя пляны павінны быць прыняты да выкананьня і разьмеркаваны па сёлах, калгасах, саўгасах і кулацкіх гаспадарках.

Усю работу па бульбазагатоўках трэба ўзяць пад жорсткі кантроль рабочых брыгад.

Тэндэнцыі месьніцтва павінны быць ліквідаваны.

Папярэджваем, што зрыў пляну загатовак паасобнымі раёнамі, невыкананьне нарадаў на вываз будуць разглядацца, як невыкананьне галоўнейшых гаспадарча-палітычных кампаній.

За сакратара ЦК КП(б)Б Сянкевіч.

Намесьнік старшыні СНК БССР Калнін.

200 тысяч руб. прамтаварамі — на прэміяваньне за ўборку

Пастанова эканамічнай народы пры СНК БССР

У разьвіцьцё пастановы Савету Народных Камісараў БССР ад 3 кастрычніка г. г. «Пра ход загатоўкі і адгрузкі бульбы» (апублікаванай у газэце «Савецкая Беларусь» № 231 за 4 кастрычніка 1930 г.), Эканамічная Нарада БССР пастанаўляе:

1. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Гандлю вылучыць фонд з прамтавараў на суму да 200 тыс. рублёў для прэміяваньня рабочае сілы, якая спэцыяльна набіраецца савецкімі і калектыўнымі гаспадаркамі для капаньня бульбы.

2. Прэміяваньня рабіць у разьмеры 20 проц. агульнай сумы, што выплачваецца выключна наёмнай рабочай сіле за капаньне бульбы, паводле сьпісаў, складзеных кіраўнікамі савецкіх гаспадарак і кіраўніцтвамі калгасаў, на якіх ускладаецца адказнасьць за правільнае складаньне гэтых сьпісаў.

3. Да атрыманьня з саюзных рэсурсаў памянёных у арт. 1 фондаў, прапанаваць Наркамгандлю і Белкаапсаюзу забясьпечыць безадкладную выдачу гэтых фондаў з наяўных рэсурсаў. Даручыць Белкаапсаюзу, з прыцягненьнем Белкалгасцэнтру і Белсельтрэсту на працягу 24-х гадзін разьмеркаваць гэты фонд па раёнах і спажывецкіх таварыствах.

4. Прапанаваць Наркамгандлю і Белкаапсаюзу тэрмінова ўзьняць у саюзных органах пытаньне аб прыраўнаньні тэрміну адгрузкі для БССР прамтавараў на прэміяваньне здатчыкаў бульбы да тэрміну адгрузкі гэтых тавараў у асноўныя збожжазагатоўчыя раёны Саюзу ССР.

5. Забараніць раённым выканаўчым камітэтам перагляд плянаў бульбазагатовак у бок іх памяншэньня.

6. Адзначаючы, што некаторыя раённыя выканаўчыя камітэты абмяжоўваюць дзейнасьць спажывецкай каапэрацыі ў галіне загатоўкі бульбы праз вызначэньне для яе некаторай колькасьці сельсаветаў, прапанаваць раённым выканаўчым камітэтам скасаваць усякія абмежаваньні ў рабоце спажывецкай каапэрацыі, апроч работы ў прызаводзкай зоне, якая ўстанаўляецца ў поўнай адпаведнасьці з інструкцыяй Наркамгандлю.

7. Пацьвердзіць ранейшую пастанову Экана аб устанаўленьні дзьвёх цэн на бульбу: на сталовую бульбу 3 р. 60 к. і тэхнічную—3 р. 12 к. за цэнтнэр.

Час. в. аб. Старшыні Эканамічнае Нарады БССР **А. Калнін.**

Нам. кіраўніцтва спраў СНК і Экана БССР **Дубавіцкі.**

Правесьці бальшавіцкую праверку

Арганізаваць калгасны прыліў

14-га кастрычніка праводзіцца дзень ураджая і калектывізацыі. У зьвязку з гэтым Цэнтральны Камітэт кампартыі Беларусі абвяшчае аб правядзеньні ўдарнага дзесяцідзёньніка, з 6-га па 16-е кастрычніка, у час якога павінна быць зроблена генэральная праверка выкананьня плянаў восенных сельска-гаспадарчых кампаній.

Восенная сяўба, зяблевая ўспашка, уборка хлеба і бульбанарыхтоўкі, будаўніцтва ў калгасах і саўгасах, арганізацыя жывёлагадоўлі і сьвінаводзтва—ўсе гэтыя вялізарнейшыя палітычныя кампаніі павінны ў час гэтага дзесяцідзёньніка падпасьці пад самы шырокі агляд грамадзкасьці.

Побач з вялізарнейшымі посьпехамі ў правядзеньні гэтых кампаній мы маем і шмат недахопаў.

Тэмпы сяўбы на сёньняшні дзень далёка нездавальняючыя, таксама і зяблевай успашкі. Недапушчальна марудна разгортваецца кампанія хлеба і бульбанарыхтовак. Прычына гэтага—яшчэ слабая работа мясцовых арганізацый, няўменьне арганізаваць масу на выкананьне пастаўленых партыяй задач стаўка на самацёк, нежаданьне некаторых працаўнікоў нажымаць на кулацтва і сварыцца з ім.

Пасьпяховае выкананьне ўсіх гэтых кампаній ня ўвязана з карэнной задачай партыі і рабочае клясы—арганізацыі новага калгаснага прыліву. Замест патрэбных баявых тэмпаў работы існуе часам мядзьвежая непаваротлівасьць, апартуністычная стаўка на самацёк і поўная адсутнасьць патрэбнай работы.

Ліквідаваць прарывы ў выкананьні плянаў сельска-гаспадарчых кампаній, разгарнуць падрыхтоўку да дню ўраджая і калектывізацыі, выкананьне ўсіх сельска-гаспадарчых кампаній паставіць на службу калектывізацыі, арганізаваць магутны прыліў у калгасы беднаты і серадняцтва, нанесьці руйнуючы ўдар па апартуністычных стаўках на самацёк, па кулаку—вось асноўныя задачы гэтай баявой праверкі.

Раённыя штабы, брыгады па сельсаветах, рабселькоры павінны пабудаваць сваю працу так, каб была забясьпечана самая шырокая бязьлітасная крытыка ўсіх недахопаў.

Толькі пры ўмовах правядзеньня сапраўднай ленінскай лініі партыі, змагаючыся з апартуністымі і «левымі» загібшчыкамі, магчыма ліквідаваць прарывы і пасьпяхова выканаць вызначаныя партыяй задачы і арганізаваць магутны калгасны прыліў.

Да ўсіх рабселькораў

Зараз пачынаецца генэральная праверка выкананьня ўсіх гаспадарча-палітычных задач, зьвязаных з восенным пэрыядам. У правядзеньні праверкі рабселькоры павінны адыграць выключна важную ролю. **Пераключайцеся на баявыя тэмпы работы, арганізуйце ўдарныя селькораўскія брыгады, прымайце самы актыўны ўдзел у генэральнай праверцы.**

Таварышы селькоры, посьпех праверкі ў ва многім залежыць ад вас. Мабілізуйце ўсе свае сілы на правядзеньне генэральнага агляду, змаганьне за бальшавіцкія тэмпы сяўбы уборкі бульбы, за выкананьне плянаў збожжа-і бульбазагатовак, за паскарэньне тэмпаў будаўніцтва і камплектаваньня сьвінаводных і жывёлагадоўчых саўгасаў і калгасаў, за арганізацыю новага калгаснага прыліву. Пакажэце прыклад ударнай работы. Таварышы селькоры! Прымайце асабісты ўдзел у ліквідацыі прарываў. Дружна арганізавана, калектыўна за работу!

Выканаў гадавое заданьне

Замастоцкі нарыхтоўчы пункт першы ў Віцебскім раёне выканаў гадавое заданьне па хлебанарыхтоўках, загатовіўшы на 5-е кастрычніка 365 цэнтнераў збожжа.

Зноў навісла пагроза „пробкі“

Максімум увагі разгрузцы чыгуначнага вузла

ТРЭБА ЗАХОЎВАЦЬ ЯКАСЬЦЬ БУЛЬБЫ

У апошнія дні на чыгуначным вузле накапілася шмат вагонаў з розным грузам, асабліва з бульбай, якія стаяць нявыгружанымі. Грузамі забіты пакгаузы. У пакгаузах маецца да 15 вагонаў розных грузаў. На 5-е кастрычніка на вузле мелася **да 65 вагонаў з бульбай.**

З боку чыгункі, саюзтрансу і ЦРК назіраецца непаваротлівасьць, безгаспадарчасьць і безадказнасьць у адносінах да выгрузкі бульбы. У той час, калі Маркаўшчына зьвязана з чыгункай асобнай веткай, калі бульбу ў Маркаўшчыну магчыма было даставіць у вагонах па лініі, мы назіраем такія брыдкія факты, як выгрузка бульбы на вузле і дастаўка яе на падводах у Маркаўшчыну. Акрамя таго, мы назіраем безгаспадарчыя адносіны да мяшкоў. Не скарыстана магчымасьць аслабаненьня да 7 тысяч мяшкоў шляхам разгрузкі бульбы. З боку чыгункі адсутнасьці мяшкоў затрымліваецца разгрузка вагонаў. Нерацыянальна і бюракратычна скарыстоўваецца транспарт. Ёсьць факты няяўкі ў свой час агэнтаў па прыёмцы і разгрузцы бульбы, у выніку чаго маюцца вялікія прастоі падвод. Акрамя таго, адносіны да якасьці бульбы зусім безадказныя, няма ніякай беражлівасьці, мяшкі кідаюцца як папала, ад чаго траціцца якасьць бульбы, якую амаль нельга будзе захоўваць на зіму.

Усім гэтым брыдкасьцям трэба палажыць канец. Трэба прыняць рашучыя меры ў адносінах разгрузкі вузла, асабліва ў адносінах разгрузкі вагонаў з бульбай. Трэба спыніць безгаспадарчасьць і безадказнасьць.

На барацьбу супроць фашысцкай дыктатуры

За Савецкую Польшчу

Адозва Камуністычнай партыі Польшчы да працоўных мас Польшчы, Зах. Украіны і Зах. Беларусі

У зьвязку з набліжэньнем соймавых выбараў у Польшчы, Цэнтральны Камітэт кампартыі Польшчы зьвярнуўся да працоўных мас з адозвай, у якой дае дакладную характарыстыку сучаснага гаспадарчага і палітычнага становішча краю.

«Крывавая фашысцкая дыктатура Пілсудзкага,—пачынаецца адозва,—назначыла новыя выбары ў сойм. Ва ўмовах фашысцкай дыктатуры расьпісаньне выбараў у сойм мае на мэце скрыць перад працоўнымі масамі сапраўдныя мэты фашызму, адыгрываючы рабочых, сялян і салдат ад сапраўднай барацьбы за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры, за дыктатуру пралетарыяту, за савецкую Польшчу. Пілсудзкі назначыў выбары ў сойм, каб адхіліць увагу мас ад непасрэднай барацьбы за хлеб, за працу, за зямлю, за самавызначэньне падняволенных народаў аж да аддзяленьня, каб адхіліць увагу ад ваенных падрыхтаваньняў да нападу на СССР. Але пры сучасным гаспадарчым і палітычным становішчы Польшчы гэтыя сродкі не дасягнуць мэты.

«Пралічыцца стары грабежнік рабочых і сялян, — гаворыцца далей у адозве. — Пралічацца таксама розныя Дашынскія, Вітасы, Багінскія і Путкі, якія са скуры лезуць, каб выратаваць фашысцкую дыктатуру.

Ніштo ня можа ўжо зараз скрыць таго факту, што фашысцкі блёк знаходзіцца зараз у стане глыбокага развалу і распаду, што фашысцкія ўрады давялі край да гаспадарчага зруйнаваньня, кінулі самыя шырокія працоўныя масы гарадоў і вёсак на дно самай страшэннай галечы і прыгнечаньня. **Бычэрпалася цярпеньне працоўных мас! Чым далей, тым усё больш грозным становіцца абурэньне мас, усё больш часта і магутна выступаюць на вуліцу рабочыя і сяляне з патрабаваньнем: працы, хлеба і зямлі.** Працоўныя масы досыць націрпеліся за час 12-гадовага кіраўніцтва ўрадаў буржуазіі, 4-гадовага кіраўніцтва фашысцкай дыктатуры, урадаў голаду, беспрацоўя, белага тэрору і вайны. Вялізарная армія беспрацоўных і напалову беспрацоўных, узмацненая эксплёатацыя прамысловых і сельска-гаспадарчых рабочых, страшэнны голад бязрольнага і маларольнага сялянства на зямлю, падатковы грабёж шырокіх працоўных мас, узмацняючыся тэрор паліцыі і фашысцкіх баёвак, кулі — замест хлеба, турма —замест працы, дзікае прыгнечаньне нацменшасьцяй фашысцкімі сатрапамі на акупаваных землях, ліхаманкавае падрыхтаваньне да ўзброенага нападу на СССР і штодзённыя антысавецкія ваенныя правакацыі—вось сумны малюнак фашысцкай Польшчы, якою—у імя і інтарэсах вялікага капіталу, фабрыкантаў, банкіраў, памешчыкаў і кулакоў—кіруе разьюшаная генэральская банда з крывавым Пілсудзкім на чале.

«Што раз мацней рвуць ланцугі польскай акупацыі працоўныя Зах. Украіны і Зах. Беларусі. Працоўныя масы Зах. Украіны і Зах. Беларусі ўсё больш усьведамляюць, што толькі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі могуць выйсьці яны з пекла сацыяльнага і нацыянальнага прыгнечаньня. У часе дадатковых выбараў у Ковелі і Лідзе, дзе сьпісы антыфашысцкага блёку атрымалі вялікую перамогу, украінскія і беларускія працоўныя масы давялі, што яны ў рэвалюцыйных радох супольна з пралетарыятам Польшчы змагаюцца супроць фашызму і акупацыі. Баявымі дэманстрацыямі (Санок, Алекшыцы) украінскія і беларускія рабочыя і сяляне ўсё больш часта пацьвярджаюць цьвёрдую волю да барацьбы за зьвяржэньне фашысцкай дыктатуры. Украінскія і беларускія сяляне пускаюць з дымам маёнткі памешчыкаў і асаднікаў польскіх казакоў. Вызваленчая барацьба працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі зьяўляецца барацьбой усяго польскага пралетарыяту. **Польскі пралетарыят можа сам парваць ланцугі клясавага прыгнечаньня толькі тады, калі злучыць сваю барацьбу супроць польскай буржуазіі з вызваленчай барацьбой працоўных мас Зах. Украіны і Зах. Беларусі супроць польскай акупацыі, за самавызначэньне аж ад аддзяленьня і далучэньня Зах. Украіны і Зах. Беларусі да брацкіх савецкіх рэспублік.**

Адозва далей паказвае працоўным масам, што:

«Перамога ў барацьбе са сьмяротным клясавым ворагам залежыць ад вас самых, ад вашага разрыву са здрадніцкімі правадырамі і далучэньнем да вялікага антыфашысцкага блёку рабочых, сялян і падняволеных народаў. Ваш лёс, лёс вашых сем'яў знаходзіцца ў вашых руках. Толькі мы, камуністыя, паказваем рабоча-сялянскім масам адзіную дарогу вызваленьня—бязьлітасную клясавую барацьбу супроць беспрацоўя, супроць лёкаўтаў, супроць забойчай капіталістычнай рацыяналізацыі, супроць дзікай эксплёатацыі працоўных жанчын і малалетніх, супроць сацыял-фашысцкага і фашысцкага арбітражу, які душыць забастовачную барацьбу, супроць шарварочнага прыгону, супроць зьдзекаў над батракамі і сялянскай беднатой, супроць падатковых і вайсковых цяжкасьцяй, супроць эксплёатацыі домаўласьнікаў і багатых купцоў. Толькі мы, камуністыя, паказваем вам адзінае рэвалюцыйнае вырашэньне крызісу: зьвяржэньне панаваньня капіталу шляхам узброенага паўстаньня рабочых, сялян і салдат і стварэньня рабоча-сялянскага ўраду, ураду рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Бо толькі рабоча-сялянскі ўрад, урад дыктатуры пралетарыяту, абапіраючыся на брацкі саюз рабочых і сялян, экспрапрыруе капіталістых, канфіскуе на карысьць рабоча-сялянскага ўраду банкі, фабрыкі і заводы, капальні і чыгункі, увядзе 7-гадзінны рабочы дзень, скасуе капіталістычную сыстэму прадукцыі, якая давала прыбыткі фабрыканту і буржуазнай дзяржаве, і гэтым самым зьнішчыць раз на заўсёды беспрацоўе так, як яно зьнішчана ў СССР.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад канфіскуе памешчыцкую зямлю і аддасьць яе працоўнаму сялянству і батраком.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад, урад дыктатуры пралетарыяту зьнішчыць імпэрыялістычныя трактаты, вырашыць справу Верхняй Сілезіі на аснове самавызначэньня аж да аддзяленьня, ажыцьцёвіць лёзунг самавызначэньня падняволеным польскім імпэрыялізмам Зах. Украіны і Зах. Беларусі і далучэньня іх да Украінскай і Беларускай Савецкіх рэспублік.

Толькі рабоча-сялянскі ўрад канфіскуе багатыя палацы буржуазіі і магнатаў і аддасьць іх на скарыстаньне рабочым і сялянам, дасьць свабоду тысячам палітвязьняў і ўсім засуджаным за барацьбу за штодзённы кавалак хлеба, а пасадзіць за краты крывапійцаў і катаў працоўных мас.

Толькі рабоча-салянскі ўрад заключыць брацкі саюз з СССР, дзе разгортваецца магутнае сацыялістычнае будаўніцтва, дзе няма эксплёатацыі і прыгнечаньня працоўных мас.

«Рабочыя і сяляне!

Урад і цэнтралевая «апазіцыя» хочуць з выбараў пабудаваць плаціну, якаб устрымала ваша імкьненьне да барацьбы за хлеб, працу, зямлю і ўладу. Праламеце гэтую плаціну! **Ідзеце на выбары, каб заманіфэставаць сваю волю да рэвалюцыйнай барацьбы!** Заклікаем вас згуртаванымі радамі стаць вакол камуністычнае партыі, супроць антыфашысцкага блёку. **Ні аднаго голасу рабочага і селяніна за ўрадавыя сьпісы і сьпісы ўрадавых агітатараў з Цэнтралеву! Ні адзін з вас не павінен устрымацца ад галасаваньня!**

Стварайце на кожнай фабрыцы, капальні, варштаце, фальварку і вёсцы, органы адналітага фронту працоўных мас — антыфашысцкія выбарчыя камітэты. На кожны замах фашызму на вашу свабоду адкажэце масавай палітычнай забастоўкай і вулічнай дэманстрацыяй. Арганізуйце дружыны масавай рабоча-сялянскай самаабароны на кожнай фабрыцы, заводзе, фальварку, вёсцы.

Прэч фашысцкую дыктатуру Пілсудзкага! Сьмерць фашызму!

Прэч дэмакратычнае ашуканства Цэнтралеву!

Прэч акупацыю Зах. Украіны і Зах. Беларусі! Няхай жыве самавызначэньне аж да аддзяленьня і далучэньня Зах. Украіны і Зах. Беларусі да УССР і БССР!

Няхай жыве Савецкая Польшча»!

Бульба павінна быць...

Нарыхтоўка бульбы па Віцебскаму раёну яшчэ ідзе вельмі нездавальняюча. Толькі замастоцкі нарыхтоўчы пункт больш-менш спраўляецца, выканаўшы на 5-е кастрычніка 80 проц. гадавога заданьня. За апошнюю пяцідзёнку гэты пункт даў 8 вагонаў бульбы. Сяляцкі нарыхтоўчы пункт 4-га кастрычніка нагрузіў два вагоны бульбы, старасельскі—2 вагоны. З боку чыгункі прымаюцца ўсе меры да таго, каб забясьпечыць нарыхтоўчыя пункты неабходнай колькасьцю вагонаў.

Віцебскі райком КП(б)Б зараз паслаў у вёску на бульбанарыхтоўкі 27 актывістых, але-ж на месцы ў правядзеньні гэтай кампаніі ўдзельнічае, галоўным чынам, каапэрацыйны актыў. Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі ня прымаюць належнага ўдзелу ў справе бульбанарыхтовак.

Да гэтага часу яшчэ плян па некаторых вёсках не даведзены да двара. Райспажыўсаюз з пачатку спадзяваўся на самацёк і толькі ў апошні час пачаў разгортваць кампанію, вызначыўшы тэрмінам давядзеньня пляна бульбанарыхтовак да двара... 5-га кастрычніка.

У вёсцы Жыгала, Астровенскага сельсавету, пад уплывам кулацкай агітацыі, сяляне адмовіліся здаваць бульбу ў каапэрацыю. У Сяляцкім сельсавеце, у асобных вёсках, сходы згадзіліся здаць бульбы толькі 20 проц. заданьня. Мясцовыя арганізацыі не далі належнага адпору кулацкай агітацыі, ня здолелі арганізаваць бядняцка-серадняцкую масу.

Марудзіць нельга. Трэба прыняць усе меры к самаму рашучаму разгортваньню бульбанарыхтовак. Жорстка ўдарыць па кулаку і яго дакаможніку—праваму апартуністу, якія перашкаджаюць забясьпечаньню рабочых цэнтраў бульбай.

Рабкор.

Фабрыка імя Лекерта мае запазычанасьць перад пяцігодкай

ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯ І ФАБКОМ ПАВІННЫ ПА-САПРАЎДНАМУ ПАВЯРНУЦЦА ТВАРАМ ДА ВЫТВОРЧАСЬЦІ

Час „лекертаўцам“ узяцца за працу па-ударнаму!

Устрахануць шкодны застой

Правы апартунізм на практыцы

На віцебскай абутковай фабрыцы імя Лекерта з боку партканлектыву і прафарганізацыі ня было зьвернута належнай увагі на падрыхтоўку і прапрацоўку сустрэчнага прамфінпляну. Ня гледзячы на тое, што рабочыя на ўсіх агульных сходах па прапрацоўцы сустрэчнага прамфінпляну заяўлялі, што новы плян рэальны і яго можна выканаць з гонарам, але сэкратар партканлектыву т. Крэндзель у асабістай гутарцы заявіў: «прамфінплян 1929—30 г. мы ня выканалі на 15 проц., але я не магу ручацца, што плян пераходнага кварталу таксама будзе недавыканан на 15 проц., ня гледзячы на то, што Белскурабʼяднаньне скараціла праграму на 600 пар абутку ў дзень».

Вось такія права - апартуністычныя размовы сэкратара партыйнага калектыву Крэндзеля. Апроч прапрацоўкі сустрэчнага на агульных сходах нічога ня зроблена па давядзеньню прамфінпляну да кожнага варштату.

Прэміравалі пʼяніц, прагульшчыкаў

Дзень ударніка на фабрыцы прайшоў габінэтным парадкам. Ніякай падрыхтоўчай працы і прыцягненьня мас ня было і прэміраваньне таксама атрымалася нейкае цікавае. Так, прэміраван сэкратар цэхавай ячэйкі закройнага цэха Махтэйс і старшыня цэхкамітэту загатовачнага цэху Паташкоў, які сваім падхалімствам да адміністрацыі дабіўся пасылкі на курсы майстроў. Рабочыя зьдзіўляюцца і запытваюцца, за што-ж іх прэміравалі. На ф-цы маецца шмат ударнікаў, якія праявілі сабе з добрага боку, як на вытворчасьці, так і ў грамадзкай працы.

Прэміравалі таксама пʼяніц, маючых прагулы. Так рабочы рантовага цэху Елецкі сыстэматычна пʼянствуе, па чатыры дні ня выходзіць на работу, Харашэўскі Паўла, хранічны пʼяніца, мае салідны стаж прагулаў і яшчэ шэраг іншых пʼяніц-прагульшчыкаў былі прэміраваны.

Парткалектыў і фабком зусім не кіравалі прэміраваньнем лепшых рабочых, а ўсё рабілася адным намесьнікам старшыні фабкому Рабіновічам. Цікава тое, што ніводнага рабкора, сярод якіх маецца значная частка прыкладных рабочых, лепшых ударнікаў, якія ўвесь час выкрывалі ўсе недахопы, якія маюцца на фабрыцы і праз газэту мабілізавалі масы на ліквідацыю прарываў,—не знайшлі патрэбным прэміраваць. Маюцца таксама прыкладныя ўдарнікі, якія заслугоўвалі прэміраваньня, але фабком так захапіўся прагульшчыкамі і пʼяніцамі, што аб іх забыўся. Усе рабочыя завода абураны такім падыходам да прэміраваньня ў дзень ударніка.

Культ-масавай працы не праводзяць

Сярод рабочых і асабліва новых культмасавай работы ніякай не праводзіцца і ў выніку гэтага маюцца такія выпадкі, калі старыя рабочыя, як Саламонік, пры правядзеньні падпіскі на пазыку «Пяцігодка—у чатыры гады», атрымліваючы пэнсіі 225 р. у месяц, падпісаўся на 25 руб. Апроч гэтага праводзіў сярод рабочых кулацкую агітацыю, што моў цяпер мяне не ашукаеш, цяпер я магу і зусім не падпісвацца. Не адстае ад яго і другі рабочы фрэйзэроўшчык, Фрыдман, які ўвесь час вядзе антысавецкую агітацыю. Разам з ім і рабочы закройнага цэху Блонштэйн Я., які ў час работы займаецца сыстэматычнай агітацыяй супроць мерапрыемстваў грамадзкага харчаваньня і іншых мерапрыемстваў Савецкай улады, гэтым самым адцягваючы рабочых ад работы на вытворчасьці. Партыйная і прафарганізацыя цэху нічога ня робяць, каб даць рашучы адпор усім гэтым контрэвалюцыйным разважаньням і разгарнуць належную растлумачальную працу сярод рабочых.

Аб калдагаворнай кампаніі забыліся

Праверка старога калдагавора на фабрыцы да гэтага часу не пачалася і, як відаць, фабком нічога і ня думае рабіць, бо ён захапіўся раздачай ордэраў рабочым на прадпрыемстве замест таго, каб гэта рабіла каапэрацыйнае бюро, а сваю работу закінуў.

Прафработа не перабудована і стаіць на мёртвай кропцы. Гаркому партыі і Гарпрафсавету неабходна заглянуць на абутковую фабрыку імя Лекерта і зрабіць належныя вынікі.

М. Скараходаў.

Злачынная нераспараджальнасьць

Абутковая фабрыка Лекерта з новага бюджэтнага году павінна па прамфінпляну выпрацоўваць 4100 пар абутку ў суткі. Уся выпрацоўваемая прадукцыя павінна быць пераведзена канторы ВКО, але апошняя ня мае магчымасьці прымаць ад фабрыкі штодзённа выпрацоўваемую колькасьць абутку і гэта заграмаджае фабрыку, а таксама склад скурсындыкату.

На 6-е кастрычніка г. г. на складзе скурсындыкату маецца 25000 пар абутку і на фабрыцы 7000 пар. Гэта колькасьць ня можа быць скарыстана, з прычыны адсутнасьці нарадаў з беларускай канторы ВКО. Такія адносіны да работы зьяўляюцца злачыннымі.

Неабходна зараз высьветліць пытаньне, па чыёй віне дапускаецца такая нераспараджальнасьць.

Скурсындыкаці.

Вазглавіць ініцыятыву рабочых

Віцебская шчотачная фабрыка мае вялікія дасягненьні. Прамфінплян за мінулы год у колькасных паказальніках выкананы на 103,4 проц. Фабрыка дабілася перамогі, дзякуючы ініцыятыве рабочых. Побач з гэтым на фабрыцы ёсьць шмат недахопаў, перашкаджаючых пасьпяховаму разьвіцьцю фабрыкі.

Можна даць значна больш

Якасныя паказальнікі прамфінпляну не давыкананы. Сабекошт выпускаемай прадукцыі зьніжаны толькі на 9,5 проц., замест вызначаных 11,5. Наогул кажучы, фабрыка здольна даць прадукцыі значна больш, чым дае зараз.

Перш за ўсё трэба адзначыць, што на фабрыцы зусім не адчуваецца адзінаначальне. Дырэктар фабрыкі ўмешваецца ў дробныя распараджэньні інструктароў, лаецца з імі ў цэху і гэтым самым падрывае аўтарытэт інструктароў перад рабочымі. Уся грамадзкасьць фабрыкі гаворыць аб тым, што адзінаначальне на фабрыцы не адчуваецца.

Адносіны адміністрацыі да вытворчых прапаноў рабочых вельмі кепскія. Прапановы ляжаць у стале заводакіраўніцтва месяцамі, ніхто імі ня цікавіцца, ніхто за іх ажыцьцяўленьнем не наглядае. Бюракратызм, цяганіна—вось што характарызуе правядзеньне ў жыцьцё рабочых прапаноў.

На вытворчасьці ёсьць шмат дробных недахопаў, якія перашкаджаюць пасьпяховаму разгортваньню працы на фабрыцы. Напр. замежныя аўтаматы працуюць нездавальняюча з-за таго, што падаецца дрэнна апрацаваны волас і ў выніку гэтага вельмі хутка знашваюцца часткі аўтаматаў.

Бяз руля і бяз вятрыл

Фабрыка дабілася перавыкананьня прамфінпляну ў выніку ўздыму ініцыятывы рабочых, але-ж у апошні час назіраецца поўны заняпад ударніцтва, поўнае адсутнічаньне кіраўніцтва ўдарнікамі з боку фабрычных арганізацый. Існуючыя калісьці ўдарныя брыгады распаліся. Фабком ня ведае нават колькі ўдарнікаў на вытворчасьці. Сэкратар партыйнай ячэйкі зусім ня ведае, колькі камуністых і камсамольцаў зьяўляецца ўдарнікамі, а між тым пры разгортваньні ўдарніцтва фабрыка змагла-б дабіцца значнага палепшаньня сваёй працы. Вось прыклад: два токары, вырабляючыя ручкі для пэндзлей, зараз разьбілі апэрацыю на два працэсы: адзін абтачвае ручку, другі вытачвае дзюрку ў сярэдзіне. У выніку гэтага прадукцыйнасьць працы ўзьнялася прыкладна процантаў на 40.

Прамфінплян да цэху даведзены, але-ж аб тым, як ідзе выкананьне гэтага пляну кожным рабочым, колькі дае рабочы прадукцыі кожны дзень гэтага ня відаць. У ва ўсіх цэхах вісяць чорныя і чырвоныя дошкі, але-ж ні на тых, ні на другіх нічога няма.

Сходы рабочых зьбіраюцца вельмі дрэнна. Фабком склікае сходы ў абедзеныя перапынкі, з тым каб рабочыя адпрацоўвалі пазьней на фабрыцы. Нам здаецца, што гэта ня мэтад для скліканьня сходаў. Прадпрыемства павінна працаваць ва ўстаноўлены час, а сходы павінны склікацца пасьля работы.

Кампанія складаньня сустрэчнага прамфінпляну ня была праведзена з належнай актыўнасьцю. Супроць мінулага году фабрыка будзе даваць прадукцыі на 85 проц. больш. Па сустрэчнаму прамфінпляну рабочыя высунулі колькасьць выпрацоўкі на 100.000 р. больш.

С—кі.

Лепшыя ўдарнікі

У «Дзень ударніка» на шчотачнай фабрыцы прэміравана 19 лепшых ударнікаў, у ліку якіх:

Рабочы **Тэф**—кіставязачнага цэху, камсамолец, працуе на фабрыцы тры гады. Прыкладны рабочы.

Шчаглоў—рабочы кіставязачнага цэху.

Фэдыёў—рабочы цыркулярнага цэху, які апроч прыкладных адносін да працы, яшчэ і вынаходца.

Макараў—рабочы цыркулярнага цэху, на фабрыцы працуе каля трох год, прыкладна адносіцца да працы, ўнёс прапанову аб удасканаленьні да варштату, якая зараз праведзена ў жыцьцё.

Балаканаў—стары рабочы, вынаходца, прэміраваны яшчэ і ў 1926 г. за вынаходзтва.

Клігер — рабочы цыркуляршчык, дабіўся значных дасягненьняў у справе скарыстаньня адкідаў.

Швайнштэйн—работніца наборнага цэху, яшчэ з 1919 году працуючая на фабрыцы, падае лепшыя прыклады адносін да вытворчасьці.

Васілевіч—рабочы аддзелачнага цэха, добра працуе на вытворчасьці, зьнізіў расцэнкі.

Эцінген—стары рабочы, пры дапамозе якога атрымалі кваліфікацыю ўсе рабочыя цэха.

Мірынгоф, які дае вельмі добрую якасьць прадукцыі.

Лім—інструктарша зубного цэха, вылучэнка з ленінградзкай фабрыкі, дабілася ўзорнай пастаноўкі працы цэха.

Парэцкі—партыец, мэханік фабрыкі, добра ўстанавіў замежныя варштаты і наладзіў хуткі рамонт машын і іншыя ўдарнікі.

Фабком не сьпяшаецца

На шчотачнай фабрыцы кампанія па перазаключэньню калдагавароў яшчэ зусім не разгорнута. Гэтае пытаньне толькі яшчэ разьбіралася на п а с е д ж а н ь н і фабкома і пакуль што, уся работа абмежавалася вынесьненем пастановы аб выдзяленьні адпаведнай ЧКК.

Насьценная газэта таксама дрэнна прымае ўдзел у гэтай кампаніі.

Газэта зьмясьціла адзін артыкул аб кампаніі агульнага зьместу, які пры гэтым яшчэ дае няправільную палітычную ўстаноўку, разглядаючы калдагавор па апартуністычнаму, як толькі абавязкі адміністрацыі, а не двухбаковае абавязацельства і адміністрацыі і рабочых, накіраванае да забясьпечаньня выкананьня прамфінпляну.

Так далей быць ня можа. Трэба па баявому ўзяцца за праверку выкананьня калдагавора і адміністрацыяй і рабочымі. Рабкораўскім брыгадам трэба праверыць кожны пункт, кожнае абавязацельства дагавора.

Унутраныя рэсурсы на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады

На „Чырвоным мэталісьце“, „Дзьвіне“, „Прафінтэрну“ ляжаць значныя запасы сырцу і прадукцыі

(На нарадзе гаспадарнікаў і старшынь фабзаўмясцкомаў па пытаньню аб мабілізацыі ўнутраных сродкаў і становішчы беларускай прамысловасьці)

5-га кастрычніка, пры шырокім удзеле старшынь фабзаўмясцкомаў адбылася нарада гаспадарнікаў па пытаньню аб мабілізацыі ўнутраных сродкаў і становішчы беларускай прамысловасьці.

Старшыня камісіі ВСНГБ т. **Краноўскі** рабіў даклад аб некаторых выніках 2-га году пяцігодкі, аб становішчы нашай прамысловасьці і пэрспэктывах на 1930—31 г.

Тав. **Краноўскі** паказаў у сваім дакладзе, што па прыблізных выніках па ўсёй Беларусі за 11 месяцаў прамфінплян выканан на 95,2 проц. Зараз пачынаецца адрэзак часу, пасьля якога мы ўступаем у трэці год пяцігодкі. У новым годзе мы павінны павесьці яшчэ большы наступ на высоты нашай прамысловасьці. У той час, калі ў 1929—30 г. мы далі прадукцыі на 300 млн. рубл., дык у 1930—31 г. беларуская прамысловасьць павінна будзе вырабіць прадукцыі на 598 млн. руб. Намячаецца вялікі плян капітальных работ.

Віцебск займае вялікае месца ў беларускай прамысловасьці. У гэтым індустрыяльным цэнтры прымячаецца вялікі рост прамысловасьці. Па апошніх лічбах мы бачым, што Віцебск, як прамысловы цэнтр у многа раз вырас супроць мінулых год. Возьмем, напрыклад, склад рабочых. У той час, калі ў 1928 г. у Віцебску было 22 тысячы рабочых, на сёньняшні дзень у віцебскай прамысловасьці занята 49 тысяч рабочых.

Зараз задачай рабочае клясы зьяўляецца пасьпяховае выкананьне пляну кастрычнік—сьнежань.

Віцебская прамысловасьць за тры месяцы павінна выпрацаваць столькі прадукцыі, сколькі выпрацоўвалася за ўвесь 1927 г.

Хворым зьявішчам, перешкаджаючым выкананьню прамфінпляну зараз зьяўляецца цякучасьць рабочай сілы. На «Дзьвіне» цякучасьць рабочай сілы ставіць пад пагрозу выкананьне прамфінпляну. Цякучасьць рабочай сілы тут складае 50 проц. У той час, калі прынята 1250 рабочых, звольнілася 901 рабочы. Дрэнныя бытавыя ўмовы рабочых, дрэнна наладжанае харчаваньне. Ёсьць і рвацтва сярод рабочых. Партыйныя і прафэсыйныя арганізацыі «Дзьвіны» не даацэнілі важнасьці барацьбы з цякучасьцю рабсілы.

Толькі па ініцыятыве саміх рабочых пачалася барацьба супроць лятуноў. Праведзена самакантрактацыя. Цэлыя групы рабочых далі сацыялістычнае абавязацельства застацца на прадпрыемствах да канца пяцігодкі.

У той час, калі наша прамысловасьць патрабуе кваліфікаваныя кадры, Віцебская біржа працы накіроўвае кваліфікаваных ватаршчыц на земляную працу. Трэба абвясьціць рашучую барацьбу тым, хто пераманьвае рабочых, хто садзейнічае лятунам.

Сярод адсталых слаёў рабочых, прышэдшых да нас з вёскі, прафсаюзы праводзяць слабую працу.

Пытаньне забясьпечаньня рабочых зараз нельга адмяжоўваць ад іншых гаспадарчых пытаньняў. Трэба будаваць сталоўкі для рабочых, пашыраць сетку закрытых разьмеркавацеляў.

Галоўны недахоп у працы гаспадарнікаў нашых прадпрыемстваў—гэта тое, што яны не вядуць ніякай працы сярод ударнікаў і нават ня ведаюць, сколькі ў іх ударнікаў. Удзелу гаспадарнікаў ва ўдарным руху няма.

Па ініцыятыве рабочай клясы пачаў выпрацоўвацца сустрэчны прамфінплян, але на шэрагу прадпрыемстваў гаспадарнікі ў гэты плян ня маюць веры і назіраецца такая тэндэнцыя, як быццам—«вы стойце за ваш прамфінплян, а мы вам кажам, што мы не атрымаем столькі сыравіны». Гэтым тэндэнцыям трэба даць рашучы адпор. Пры складаньні праграмы на тры месяцы кастрычнік—сьнежань патрэбна ўлічыць усе магчымасці і уключыць у праграму сустрэчны прамфінплян рабочых.

Мабілізаваць усе сродкі прамысловасьці

Член камісіі ВСНГБ т. **Бравэрман** у сваім дакладзе падводзіў вынікі працы камісіі па мабілізацыі ўнутраных сродкаў прамысловасьці.

На нашых прадпрыемствах рацыяналізатарская праца паслабла. Адсутнічае ўсялякае разьмеркаваньне вытворчых працэсаў. Ніводная рацыяналізатарская ячэйка на прадпрыемствах не займаецца вывучэньнем працягу вытворчых працэсаў, а гэта дало-б не адну тысячу рублёў эканоміі. Калі мы прышлі на прадпрыемства, каб выявіць магчымасьці мабілізацыі сродкаў вытворчасьці, дык нам адказалі: «Мы ўжо пачысьціліся».

Пры павярхоўным абсьледваньні камісія ВСНГБ выявіла, што на заводзе «Чырвоны Мэталіст» ёсьць запас мэталю—зараз вострага дэфіцытнага. Там ёсьць 327 тон матар'ялаў, а між тым толькі частка з іх патрэбна заводу. На заводзе выяўлена 600 клгр. лістовай медзі, якую завод ня ўжывае і яна ляжыць на заводзе другі год не скарыстанай. Выяўлена шэраг іншых дэфіцытных матар'ялаў, якія заводу непатрэбны. На фабрыцы «Дзьвіна» выяўлены вялікія запасы скураных рэмняў.

На прадпрыемствах няма нормы запасаў. Напрыклад на заводзе «Чырвоны Мэталіст» з-за адсутнасьці разнарадак скапіўся запас у 175 лябёдак (175 тысяч рублёў), на 1-й швэйнай фабрыцы «Прафінтэрн» скапіліся вялікія запасы гатовай прадукцыі, бо адпаведныя арганізацыі ня прыслалі разнарадак. Гэта спрыяла таму, што ў нас сабраўся вялікі запас тавараў, якія нам востра неабходны. Гэтаму шкоднаму зьявішчу, мяжуючаму са шкодніцтвам, неабходна аб'явіць рашучую барацьбу.

Што казалі ў спрэчках

Выступаўшыя ў спрэчках адзначалі шэраг хваробных зьявішч у працы прадпрыемстваў і паказалі на шляхі да іх ліквідацыі. Тав. **Мазья** у сваёй прамове паказаў, што фабрыка «Дзьвіна» да канца года прышла з прарывам у 7 проц. Зараз намячаецца шэраг мерапрыемстваў для ліквідацыі цякучасьці рабсілы і г. д. Выдзяляецца фонд для падцягваньня зарплаты адсталых груп рабочых, на гэта будзе адпушчана 10 тысяч рублёў.

Тав. **Ахрамейка** адзначыў, што шэраг гаспадарнікаў займаецца пераманьваньнем рабочых з фабрыкі «Дзьвіна». У гэтым годзе з фабрыкі звольнілася 900 чал. Тав. Ахрамейка прывёў прыклад, калі адміністрацыя фанэрнага завода пераманьвала сьлесароў.

Неабходна паставіць на ўдарныя тэмпы будаўніцтва дому для рабочых фабрыкі «Дзьвіна». Неабходна палепшыць забясьпечаньне рабочых і павесьці рашучую барацьбу з лятунствам і рвацтвам на фабрыцы.

Тав. **Рабіновіч** у сваёй прамове датыкаўся пытаньня выкананьня прамфінпляну на фабрыцы імя Лекерта. Ён паказаў, што на фабрыцы няма вучоту вытворчых магчымасьцяй і наогул адсутнічае ўсялякі вучот сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Няма ніякай плянавасьці ў падрыхтоўцы кваліфікаванай сілы. Таварыш Рабіновіч прывёў прыклад, калі пасьля адчыненьня рантовага цэху на фабрыцы пачалі рыхтаваць для яго кваліфікаваную сілу. Мяркуецца заключэньне дагавароў з вучнямі, якія навучаюцца працаваць на машынах, што яны будуць працаваць на фабрыцы некалькі год.

Тав. Рабіновіч прывёў факт абураючай безгаспадарлівасьці, калі на складзе Усесаюзнага скураб'яднаньня скапілася 25 тысяч пар абутку, бо ніводная арганізацыя не паклапацілася аб тым, каб гэты абутак разьмеркаваць сярод забясьпечваючых арганізацый.

Выступіўшы ў спрэчках тав. **Кляторны** адзначыў, што на будаўнічых работах стварыліся масавая цякучасьць рабсілы, бо не наладжана добрае забясьпячэньне. Сярод сэзоньнікаў праводзіцца вельмі слабая культурна масавая праца і гэта таксама садзейнічае разьвіцьцю лятунства. На пабудовах патрэбна шмат кваліфікаванай сілы, але кадры рыхтуюцца слаба. Не хапае каменшчыкаў, плотнікаў і іншых.

Тав. **Вадзносаў** прывёў прыклады, калі на некаторых будаўнічых работах стварыліся вялікія запасы будаўнічых матарыялаў, а між тым, затрымліваецца пабудова ўдарных работ таму, што не хапае матарыялаў.

Тав. **Краноўскі** ў заключным слове паказаў, што органы Наркампрацы павінны павярнуцца да інтарэсаў прамысловасьці і павесьці працу такім чынам, каб недапускаць лятунства, аб'явіць барацьбу рвачаству і ні ў якім выпадку не дазваляць перакачоўваць з месца на месца, лятунам—шкоднікам прамфінпляну.

Тав. **Краноўскі** таксама паказаў на тое, што адпаведныя арганізацыі павінны пашырыць жыльлёвае будаўніцтва на Маркаўшчыне, стварыць такія ўмовы, каб спыніць у корані цякучасьць рабсілы на фабрыцы «Дзьвіна». Вакол прагульшчыкаў, рвачэй патрэбна стварыць грамадзкую думку і ўзьняць проці іх ярасьць мас.

Тав. **Краноўскі** востра паставіў пытаньне аб мабілізацыі ўсіх сродкаў вытворчасьці і недапушчэньні затаварваньня. Органам забясьпечаньня прадпрыемстваў неабходна павесьці сыстэматычную працу па ліквідацыі маючыхся запасаў.

Уся гэтая праца можа быць і будзе праведзена толькі пры ўвазе ўсіх рабочых, усёй савецкай грамадзкасьці да мабілізацыі сродкаў на выкананьне пяцігодкі ў чатыры гады.

С. Фейгінзон.

Правялі без належнай падрыхтоўкі

«Дзень ударніка» на шчотачнай фабрыцы правялі, як гавораць рабочыя, з «пажарнай падрыхтоўкай». І сапраўды, партыйныя арганізацыі і фабком да правядзеньня гэтага працоўнага сьвята амаль не рыхтаваліся.

Ударнікі к прэміраваньню высоўваліся насьпех, абгаварэньне высунутых кандыдатур было праведзена ня ўсюды. У некаторых цэхах фабком абмежаваўся толькі тым, што правёў гутаркі з асобнымі рабочымі аб тым, каго патрэбна прэміраваць.

На самым вечары прысьвечаным «дню ўдарніка» ня была разгорнута належная крытыка недахопаў у працы на фабрыцы; вечар прайшоў вяла. На вечары прэміравалі рознымі падарункамі 19 ударнікаў і зьнялі званьня ударнікаў з чатырох чалавек. Гэта—прагульшчыка Голубева, сімулянта Гутмана і прагульшчыка Блінкова, а чацьвертага... доўга думаў старшыня фабкому, але ўспомніць ня мог.

Дарэчы кажучы, фабком вельмі мала цікавіўся работай па разгортваньню ўдарніцтва на фабрыцы і нягледзячы на тое, што на фабрыцы ёсьць шмат прагульшчыкаў, званьне ўдарнікаў з іх ня зьнімалася. Нават сам сэкратар партыйнай ячэйкі разважае, што нельга зьнімаць званьне ўдарніка з такога рабочага, які прагуляе дзень ці паўдня.

М.

СПЫНІЦЬ ЗЛАЧЫННЫЯ СПАЗЬНЕНЬНІ ЦЯГНІКОЎ

РСІ і пракуратура павінны выявіць вінаватых і прыцягнуць да суровай адказнасьці

Патрабуем ад чыгункі чоткай працы і дапамогі ў барацьбе за прамфінплян

Прыгарадныя цягнікі на Маркаўшчыну і Чэпіна, якія дастаўляюць рабочых на фабрыкі «Дзьвіна», фанэрны завод, пабудову ў Чэпіне, у апошні час амаль штодзень даюць недапушчальныя спазьненьні. Праезд, напрыклад, на фабрыку «Дзьвіна» займае ўсяго 8—10 хвілін, а спазьненьні дасягаюць да поўгадзіны.

Вось абураючыя факты нядбайных і злачынных адносін з боку чыгункі да барацьбы за прамфінплян, якая зьяўляецца адной з важнейшых палітычных задач дню, якой занята ўся партыя і рабочая кляса: **30-га верасьня цягнік з рабочымі на фабрыку „Дзьвіна“ спазьніўся на 7 хвілін, 1-га кастрычніка—на 3 хвілін, 2-го—на 7 хв., 3-га—на 7 хв., 5-га—на 20 хв. і 6-га—на 20 хв. Цягнік на Чэпіна 6-га спазьніўся больш чым на 2 гадзіны, а праезд займае хвілін 10. Тое-ж самае назіраецца і ў адносінах дастаўкі рабочых на фанэрны завод.**

РСІ і пракуратура павінны тэрмінова заняцца расьсьледваньнем гэтых абураючых фактаў злачынных адносін працаўнікоў чыгункі да справы барацьбы за прамфінплян, трэба выявіць вінаватых, прыцягнуць іх да суровай адказнасьці. Рабочыя фабрыкі „Дзьвіна“, фанэрнага заводу і пабудовы ў Чэпіне павінны абгаварыць на сваіх сходах гэтыя брыдкія факты і патрабаваць ад чыгункі чоткасьці і бесперабойнасьці ў працы. Чыгунка павінна актыўна ўдзельнічаць і ўсямерна дапамагаць у барацьбе за прамфінплян.

Да адказнасьці злачынцаў

У ноч 5-га кастрычніка адпраўляўся на Полацак камісіённы цягнік, па загаду загадчыка манэўрамі **Валейшаніка** без адпаведнага дазволу. У гэты-ж час шоў пад хуткі цягнік № 17 паравоз з кантрольнага паста дыска «Ю», які ўрэзаўся ў цягнік. У выніку сутычкі папсаваны паравоз і вагон.

У гэту-ж ноч дзяжурны СП **Валюкевіч** загадаў прымаць з боку Ленінграда таварны цягнік на 7-мы пасажырскі шлях, дзе стаяў хуткі цягнік. Толькі дзякуючы ўважлівасьці машыніста таварнага цягніка, аварыя папярэджана.

Па гэтых справах вядзецца расьсьледваньне. СП **Шчалматкін** і загадчык манэўрамі **Валейшанак** арыштаваны.

А.

„Да вас нам няма справы“

З-за нераспараджальнасьці работнікаў чыгункі 6 гадзіны цягнік на Маркаўшчыну кожна дзень спазьняецца. За апошнія тры дні цягнік № 101 спазьняецца на 20 хвілін. 200 работніц фабрыкі кожны дзень зьяўляюцца пазьней на працу на 15—20 хвілін.

Калі супрацоўнік упраўленьня фабрыкі зьвярнуўся да галоўнага кандуктара, дык апошні паслаў яго да начальніка станцыі і пры гэтым сказаў: **«калі вам не спадабаецца, дык можаце ісьці пяшком»**, а другі рабоэнік чыгункі адказаў яшчэ лепш: **«у нас прамфінплян выконваецца, а да вас нам няма ніякай справы»**.

Рабочыя фабрыкі, абураныя гэтымі выпадкамі, просяць органы пракуратуры прыняць тэрміновыя меры і прыцягнуць вінаватых да суровай адказнасьці.

ЦРК зрывае выкананьне прамфінпляну

Нядбайнасьць, даходзячая да шкодніцтва

Зусім нядаўна «Віцебскі Пралетары»; і «Мэтпромавец» пісалі, што на заводзе «Чырвоны Мэталіст» рабочым прыходзіцца за поўгадзіны да гудка станавіцца ў чаргу за абедам, бо ЦРК прывозіць малую колькасьць абедаў, якіх не хапае для ўсіх рабочых завода.

Таксама пісалася, што намесьнік старшыні Гарсавету тав. Ягораў на катэгрычнае запатрабаваньне асобаўпаўнаважанага т. Файнберга аб упарадкаваньні водпуску абедаў на заводзе «Чырвоны Мэталіст», адказаў, што яму наогул няма часу займацца такімі дробязямі.

Ды і пасьля паказаных заметак сэкратар калектыву, рэдактар «Мэтпромаўца» і старшыня заўкому, у інтарэсах упарадкаваньня водпуску абедаў на заводзе і зьнішчэньня чаргі, дагаварыліся з тав. Фальковічам аб тым, што ЦРК будзе штодзённа дастаўляць заводу на 1-ю зьмену 700 абедаў і на 2-ю зьмену—250.

Але гэтая згода з першага-ж дню работнікамі ЦРК была парушана. Замест 700 прывозіцца 600 замест 250—200, а часам нават яшчэ меньш.

У выніку такой работы ЦРК дзесяткі і сотні рабочых, будучы ня ўпэўнены ў тым, што ім дастанецца абед, за поўгадзіны да гудка займаюць чаргу, а тым часам варштаты стаяць без працы.

Але і гэты мэтад у канечным выніку таксама не дапамагае, бо з 600 абедаў нельга зрабіць 700, а з 200 ня выкраіш 250. Вось чаму часта па 60, 80 і нават 100 рабочых застаюцца без абеда, у выніку чаго бывае цэлы шэраг нараканьняў.

Калі-б прадстаўнікі завода ня прышлі па гэтаму пытаньню ў ЦРК, тав. Фальковіч завярае, што гэта выпадковая брыдкасьць будзе зьнішчана, што факт незабясьпечаньня завода патрэбнай і пры гэтым дагаворанай колькасьцю абедаў зьяўляецца злачыннай нядбайнасьцю з боку адміністрацыі 6-й сталоўкі (той самай сталоўкі, якая нядаўна замест абеда прывязла на завод чарвей).

Мы пытаемся, колькі разоў можна дапусьціць нядбайнасьць, якая мяжуе са шкодніцтвам і дзе ў данным пытаньні, наогул, можна знайсьці мяжу паміж нядбайнасьцю і шкодніцтвам?

Трохкутнік завода неаднаразова паведамляў Гарпрафсавет, але да гэтага часу ні Гарпрафсавет, ні тым больш Гарсавет на гэта не рэагавалі.

Рабочая маса завода абурана гэтымі брыдкасьцямі і патрабуе каб пастанова заўкому аб прыцягненьні вінаватых да адказнасьці была-б у бліжэйшыя дні праведзена ў жыцьцё.

С. Шон.

Гінуць 600 мяшкоў солі

Рапарт „Віц. Пралетарыю“

На берагу ракі Дзьвіны, недалёка ад параходнай прыстані, умо трэці дзень як 600 мяшкоў солі ляжаць пад адкрытым небам і соль тае ад дожджу (частка солі знаходзіцца ў гразі). Соль прызначана для Валіскага Гарпо. Неабходны тэрміновыя меры для зьнішчэньня гэтай брыднасьці.

Брыгадзір газэты „Віцебскі Пралетары“ Славін.

Некалькі прапаноў ЦРК

У каапэрацыйным апараце ёсьць шмат недахопаў. Няма чоткасьці ў рабоце, недастатковы грамадзкі кантроль, слаба праводзіцца работа па адборы работнікаў прылаўку, асабліва загадчыкаў магазынаў, няма правільнага вучоту тавараў. Усе гэтыя недахопы кажуць аб тым, што патрабуецца зьвярнуць на нашу каапэрацыю з боку фабрык і заводаў больш увагі.

Патрэбна арганізаваць больш камсамольскіх магазынаў і вербаваць для апошніх работнікаў прылаўку з камсамольцаў.

У бліжэйшы час мы ня зможам поўнасьцю забясьпечыць рабочых мясам. Таму трэба разьвіць сьвінаводзтва, на што ЦРК трэба зьвярнуць належную ўвагу. На буйных заводах і фабрыках часта вылліваюць у выграбныя ямы памыі, якімі можна было-б выкарміць некалькі дзесяткаў сьвіней. У першую чаргу можна мабілізаваць вакол гэтага ўвагу заводу «Камінтэрн», фабрыкі «Прафінтэрн» і інш.

М. Шахнін.

Ударыць па шкодніках рабочай каапэрацыі

Па ініцыятыве рэвізыйнай камісіі **ЦРК і рабочай брыгады** завода «Чырвоны мэталіст», «Прафінтэрн», шчотачнай фабрыкі, панчошнай і калектыву ЦРК быў вытваран «налёт» на полацкі рынак для выяўленьня шкоднікаў каапэрацыі.

У выніку было затрымана каля **50 чалавек з дэфіцытнымі тавамі** (боты, галёшы, касьцюмы і інш.), якія адпускаюцца выключна па ордэрах. **Самым брыдкім зьяўляецца тое, што ў гэтай спэкуляцыі былі затрыманы паасобныя рабочыя і іх жонкі.**

Файнштэйн.

ПРЭЗЫДЫУМ ГАРСАВЕТУ НЕ КІРАВАЎ

Сацспаборніцтва і ўдарніцтва павінна стаць штодзённым мэтадам ў дзейнасьці Гарсавету

Прэзыдыум Гарсавета ніякай сувязі з сэкцыямі не падтрымліваў

Па ініцыятыве **масавага сэктару гарсавету і рэдакцыі газэты «Віцебскі Пралетары»** 6-га кастрычніка была склікана нарада бюро ўсіх сэкцый гарадзкога савету. На нарадзе абгаварывалася адно пытаньне: ажыўленьне работы сэкцый. Чым выклікана такая нарада і пастаноўка такога пытаньня? Выклікана гэта тым, што асабліва за апошні час масавая работа гарадзкога савету зусім не адчувалася. Пленумы сэкцый часта зрываліся з-за неяўкі дэпутатаў гарсавету, а тыя, якія і адбываліся, праходзілі пры вельмі малай колькасьці членаў. Спрэчкі па інфармацыі сэкратара гарсавета т. **Пракопенка** былі вельмі ажыўлёныя.

Гаварылі аб тым, што **прэзыдыум гарадзкога савету амаль ніякай сувязі з сэкцыямі ня мае.** Пратаколы сэкцый і іх пляны нават не даходзілі да прэзыдыуму, увесь час працы гарсавета амаль ніводная з сэкцый не адчыталася за сваю працу, праца сэкцый ня ўвязвалася з работай гарсавету, у выніку чаго гарсавет ня ведаў, што робяць сэкцыі і наадварот. Сэкцыі не зьяўляліся падсобным органам у рабоце прэзыдыума гарсавета, ім даваліся розныя даручэньні, абсьледваньні, расьсьледваньні, а такія пытаньні, як **складаньне гарадзкога бюджэту, праходзілі міма сэкцый і праз галаву сэкцый.**

Сэкцыі аўтарытэту ня мелі толькі таму, што іх пастановы ў жыцьцё не праводзіліся, а прэзыдыум на гэта ніякай увагі не зьвяртаў. І нават быў выпадак, калі адзін з старшынь сэкцый пераслаў акт у прэзыдыум гарсавету, а праз некаторы час колькі гэты акт ня шукалі ў прэзыдыуме, яго ніяк не змаглі знайсьці.

Не мала на гэтай нарадзе папала і мандатнай камісіі, якая за ўвесь час ніводнага разу ня склікалася і колькі сэкцыі ня пісалі аб адкліканьні непрацуючых дэпутатаў гарсавету, на гэта ўвагі не зварочвалася.

Прэзыдыум ніколі не інструктаваў бюро сэкцыі і яны былі прадастаўлены самім сабе. Разьмеркаваньне членаў па сэкцыях было непрапарцыянальнае: у адной 70 чал., у другой 7—10. Ёсьць і такія сэкцыі, як гандлёва-кааперацыйная, ня маючыя ніводнага рабочага. Да гарсавета было прымацавана **500 рабочых** з прадпрыемстваў, але ў выніку таго, што з імі ніякай працы не праводзілася, апошнія разьбеглісь з сэкцый. Зразумела, што ў гэтым вінават прэзыдыум гарсавету, які не кіраваў, не мабілізаваў масу дэпутатаў гарсавету. Але вялікая віна павінна легчы і на дэпутатаў гарсавету і, у першую чаргу, на бюро сэкцый, якія таксама кепска працавалі. Што датычыцца сувязі гарадзкога савету з масай, дык і яна кульгала. Дэпутаты гарсавету перад сваімі абіральнікамі не адчитваюцца і абіральнікі ня ведаюць аб працы дэпутатаў гарсавету. Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі на мясцох таксама ня цікавіліся працай сваіх дэпутатаў. Кепска і тое, што праца гарсавету і яго сэкцый зусім мала крытыкавалася і ў гэтым у значнай меры вінават мясцовы друк, які працу гарсавету і яго сэкцый недастаткова асьвятляў у газэце.

Трэба думаць, што зараз пасьля гэтай нарады члены бюро возьмуцца за працу і работа гарсавета ажывіцца. Сэкцыям трэба зараз мамілізаваць увагу ўсіх дэпутатаў гарсавету на выкананьне наказа, дадзенага абіральнікамі. Праходзячая зараз кампанія давыбараў дэпутатаў у гарсавет павінна таксама прайсьці пры актыўным удзеле ўсіх дэпутатаў гарсавету.

Наумскі.

Аб іншых — у наступны раз

Зараз ідзе па гораду кампанія па давыбарам членаў гарсавету па тых прадпрыемствах, дзе абраныя члены гарсавета не працавалі. І вось на некаторых з іх трэба застанавіцца.

Калі рабочыя лесазавода № 13 вылучалі ў гарсавет работніцу партыйку—камсамолку тав. **Калініну**, усе гаварылі, што т. **Калініна** будзе вельмі добра працаваць. Цікава ведаць, што зараз скажуць рабочыя на сходзе аб т. Калінінай, якая **з 19 мастрычніка 1929 г.** ні разу не была на паседжаньнях пленума гарсавету і сэкцый.

Відавочна, рабочыя фабрыкі «Дзьвіна», паслаўшыя сваім дэпутатам т. **Ахрамейка**, таксама лічылі, што **Ахрамейка** будзе актыўна працаваць, але і ён на працягу амаль **цэлага году** ня прымаў ніякага ўдзелу ў працы гарсавету. Інваліды працы, паслаўшыя ў гарсавет сваім дэпутатам тав. Рабіновіча, таксама ўскладалі вялікія надзеі на яго актыўнасьць.

Але і яны ў гэтым горка разачараваліся, бо т. **Рабіновіч** на працягу **паўтара гады** бязьдзейнічае ў гарсавеце.

Т. **Масналёў** быў паслан у гарсавет ад беспрацоўных. Ён таксама **належыць да групы бязьдзейных членаў гарсавету.** Можна прывесьці шэраг іншых прозьвішчаў, хаця-б **старшыні мандатнай камісіі т. Рабчэўскага**, які ні разу ня склікаў паседжаньне мандатнай камісіі і які яшчэ і па сёньняшні дзень, нягледзячы на тое, што ідуць давыбары ў гарсавет, ня ведае прозьвішчы тых, хто ня прымае ўдзел у працы гарсавета, але на гэтым пакі застановімся.

Аб іншых—у наступны раз.

Член гарсавета **Н. Дварсон.**

Узьняць дысцыпліну

Члены сэкцый нарасьветы, асабліва некаторыя з іх не наведваюць паседжаньняў пленумаў і наогул прымаюць слабы ўдзел у працы. У выніку часта паседжаньні пленумаў сэкцыі зрываюцца Бюро сэкцыі на апошнім сваім паседжаньні абмеркавала гэтае пытаньне і прышло да выводу, што некаторыя члены сэкцыі безадказна адносяцца да працы гарадзкога савета і пастанавіла т.т.: **Гурэцкаму, Будзько, Штэйну, Шафіраву, Улінай, Хайцінай, Саламоніку, Эйдэльштэйну, Васкевіч, Навалейка, Долгіну і Барновічу абвясьціць вымову.**

Акрамя гэтага, бюро ў мэтах узмацненьня працы сэкцыі парашыла арганізаваць сярод членаў сэкцыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва і выклікае на сацспаборніцтва сэкцыю **аховы здароўя.**

Трэба думаць, што зараз сэкцыя пачне сваю працу па ўдарнаму.

Л.

Заўтра працуюць сэкцыі Гарсавету

9-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары, склікаецца пленум **фінансавай сэкцыі** ў памяшканьні Гарсавету—пакой № 10, 1-ы паверх.

Яўка ўсіх сяброў і кандыдатаў абавязкова.

9-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары, склікаецца пленум **прамысловай сэкцыі** ў памяшканьні Гарсавету, пакой № 22, 2-гі паверх.

Павестка дня:

1) Даклад акулярнай фабрыкі аб выкананьні прамфінпляну.
2) Садаклад камісіі па абсьледваньню.
3) Даклад аб падшэфным калгасе.

Яўка ўсіх сяброў і кандыдатаў абавязкова. Запрашаюцца рабочыя акулярнай фабрыкі і прымацаваныя для работы ў сэкцыі.

9-га кастрычніка, а 7 гадзіне ўвечары, склікаецца пленум **гандлёва - кааперацыйнай сэкцыі** ў памяшканьні клюбу мэдсанпрацы па Замкавай вул.

Павестка дня:

1) Даклад ЦРК аб забясьпечаньні рабочых прамтаварамі.
2) Садаклад камісіі па абсьледваньню.

Яўка ўсіх сяброў і кандыдатаў абавязкова. Запрашаюцца рабочыя і прымацаваныя для работы ў сэкцыі.

Даеш вугальны перакоп!

КАМСАМОЛІЯ ВІЦЕБШЧЫНЫ РАЗВЁРСТКУ НЯ ВЫКАНАЛА

ШЫРЭЙ РАСТЛУМАЧЭНЬНЕ АБ ВАЖНАСЬЦІ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНЯ ДАНБАСУ РАБОЧАЙ СІЛАЙ

Узмацніць масавую работу

Віцебская арганізацыя КСМ разьвёрстку на мабілізацыю камсамольцаў у Данбас ня выканала.

Замест 93, паслана 67.

Дзе прычыны? Першае—гэта баяцца шахты. Шахты далёка ад Віцебску і некаторым здаецца, што гэта нібы катаржная праца. Нават і некаторая частка камсамольцаў, якія паехалі на Данбас, да апошняга часу хадзілі, як кажуць, «з панікшай галавой».

Па-другое, узмацнялі гэтыя кепскія настроі контррэвалюцыйныя чуткі, што Данбас горш Віцебску забясьпечваецца прадуктамі.

Па-трэцяе, ня ўцямілі самага галоўнага--значэньняДанбасу для нашай краіны, сур'ёзнасьці лёзунгу «Даёш вугальны перакоп».

На вечары провадаў мабілізаваных на Данбас аб гэтых адмоўных зьявішчах пачаў сваю прамову сэкратар Гаркому тав. Глядыш і скончыў тым, што ад імя Гаркому заклікаў камсамольцаў выканаць па - камсамольску баявыя задачы, што стаяць перад Данбасам.

Выступае стары шахцёр, рабочы - чыгуначнік.—Хачу сказаць, што дарэмна палохаюцца шахты некаторыя камсамольцы. Я сам стары шахцёр працаваў шмат год у шахтах. Праўда, цяжкая праца, але нічога страшнага для тых, хто любіць працаваць.

Значна падбадзёрыла мабілізаваных таварышоў і выступленьне т. Гальштэйна—шахцёра Данбасу, пасланага ў Віцебскі раён на камсамольскую працу. «Нічога, камсамольцы справяцца з сваёй задачай, дадуць вугаль для нашай сацыялістычнай прамысловасьці».

Павесялелі хлопцы. Бадзёра выступаюць некалькі камсамольцаў ад імя мабілізаваных, кажучы, што яны спраўдзяць надзеі партыі і КСМ...

«Прапаную зараз арганізаваць дэманстрацыю ў гонар ад'яжджаючых, будучых шахцёраў». Усе прысутныя на вечары аднагалосна падтрымалі гэтую прапанову і аб 11 гадз. начы каля 300 чал. рабочай моладзі з аркэстрам дэманстравалі па вуліцах Віцебску.

На заўтра камсамольцы паехалі на Данбас...

Заўтра апошні тэрмін пасылкі мабілізаваных на Данбас, якія дагэтуль не паехалі. Ячэйкі зусім правільна паступаюць, калі бязьлітасна выключаюць з сваіх шэрагаў тых, хто адмаўляецца ехаць на Данбас, як дэзэртыраў працы і шкурнікаў. Разьвёрстка будзе напэўна выканана. Але-ж у выніку трэба зрабіць такі вывад, што гарадзкая камсамольская арганізацыя вельмі кепска вядзе растлумачальную працу ў такой важнай кампаніі. Трэба было-б раней, а не тады, калі мабілізаваныя ў вагоны садзіліся, выявіць старых шахцёраў, каб яны расказалі аб умовах працы на шахце, запрасіць інжынэрна-тэхнічныя сілы, каб растлумачыць аб ужываньні мэханізмаў на Данбасе. Самае галоўнае гэта дабіцца, каб камсамолец уцяміў, што лёзунг «Браць вугальны перакоп»—гэта значыць ехаць на Данбас і змагацца за сацыялізм...

Наогул трэба казаць, што Данбас гэта ня першая і не апошняя масава-палітычная кампанія. Гаркому КСМ і ўсёй нашай камсамольскай арганізацыі прыдзецца ўлічыць паказаныя грубыя памылкі пры разгортваньні масавай работы і не паўтараць іх надалей.

Ц.

Зачыніўшыся ў габінэтах

Па разьвёрстцы Гаркому камсамолу, ячэйка ф-кі „Прафінтэрн» № 2 павінна была паслаць трох камсамольцаў на Данбас. Што-ж зрабіла бюро ячэйкі?

Ніякага растлумачэньня аб мэтах гэтай мабілізацыі ня было праведзена. Два дні перад адпраўкай, пад націскам некаторых камсамольцаў, бюро ячэйкі пачало абгаварвацца гэтае пытаньне. Член бюро ячэйкі, намесьнік сэкратара Рэйхрудэль склікае закрытае паседжаньне бюро ячэйкі, на якое не дапусьцілі ні партыйцаў, ні камсамольцаў і нават папрасілі выйсьці з паседжаньня членаў бюро партыйнай ячэйкі. На гэтым паседжаньні бюро вырашана пытаньне аб пасылцы толькі аднаго камсамольца, выходзячы з таго, што ён ідэалёгічна вытрыманы, не зварочваючы ўвагі на тое, што ён слабага здароўя. Праз 15 хвілін склікаецца закрыты сход ячэйкі, дзе рашаюць паслаць, апроч гэтага яшчэ аднаго хлопца. Калі камсамольцы запытваліся, чаму ўсё робіцца пры закрытых дзьвярох, без мабілізацыі грамадзкай думкі, Рэйхрудэль адказала: «так нам параіў сакратар парт'ячэйкі».

Мэдагляд прызнаў гэтых двух хлопцаў нягоднымі для пасылкі на Данбас. У выніку з ячэйкі ніхто ня едзе.

Трэба адзначыць, што ўся праца ячэйкі кульгае на абедзьве нагі. Ячэйка павінна быць аздароўлена. Гарком павінен высьветліць становішча ячэйкі і зрабіць арганізацыйныя вынікі.

І. Казанскі.
Д. Марголін.

Дэзэртырам працы ня месца ў камсамоле

У школе швэйнікаў камсамольская ячэйка пастанавіла трох камсамольцаў паслаць на работу ў Данбас, у тым ліку і камсамольца Іўрына, але ён узьняў бузу, кажучы, што ніхто ня мае права яго прымушаць. Іўрын гэтым самым падрывае аўтарытэт камсамолу і яму ня месца ў нашых шэрагах.

С. Фейгіна.

Ці бачылі вы такога арыстакрата?

Ячэйка саўгандслужачых на агульным сходзе вызначыла двух камсамольцаў Каральца і Валькідовіча для паездкі на Данбас, але-ж Каралец адмовіўся: «я не паеду на такую гразную работу, няхай едуць самі». Такіх камсамольцаў трэба гнаць вон з ячэйкі.

Дзямідзенка.

Перавыбары дэлегатак без справаздачы і падрыхтоўкі — недаацэнка палітычнай важнасьці работы сярод жанчын, правы апартунізм на практыцы

Праводзяць на скорую руку

Справаздачна-перавыбарчая кампанія дэлегацкіх сходаў па Віцебску ўсё яшчэ да гэтага часу не абярнулася ў палітычную кампанію. На многіх прадпрыемствах зусім яшчэ не прыступілі да перавыбараў, а там, дзе яны праходзяць, іх нельга назваць справаздачна-перавыбарчымі кампаніямі, бо справаздачы ня ставяцца і дэлегаткі абіраюцца на скорую руку.

На **фабрыцы «Дзьвіна»** перавыбары дэлегатак прайшлі бяз усякай падрыхтоўкі. Не мабілізавана ўвага работніц на пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Нягледзячы на тое, што ф-ка скончыла гаспадарчы год з прарывамі, сярод работніц маецца вялікая цякучасьць. У перавыбарчай кампаніі гэтае пытаньне дастаткова не завострана. Старшыня фабкому і сэкратар парткалектыву на пытаньне: «чаму выбары дэлегатак прайшлі без справаздач»—адказалі: «мы ўсё пачынаем на-нова. Жанработа была ў нас зусім заглохла Мы нават не ведаем складу дэлегатак».

Аналёгічныя адказы паступаюць і з другіх прадпрыемстваў. Жанработы сапраўда ніякай не вялося. Але гэта ня кажа аб тым, што і новыя перавыбары і далейшая праца сярод жанчын павінна быць змазана.

Трэба адзначыць, што ня толькі партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі на прадпрыемствах не прыдаюць гэтаму адпаведнага значэньня, але і гарпрафбюро таксама яшчэ палец аб палец ня ўдарыла па пытаньню аб справаздачна-перавыбарчай кампаніі дэлегатак.

Недаацэнку гэтай работы нельга інакш расценьваць як праваапартуністычныя адносіны да гэтага пытаньня.

Доук, шматыражкі яшчэ не ўзяліся за асьвятленьне гэтага пытаньня і маюцца факты (фабрыка «Прафінтэрн») калі адмаўліліся друкаваць матар'ялы па перавыбарчай кампаніі, матывіруючы тым, што ёсьць больш важны матар'ял.

Неабходна зараз-жа ўсім партыйным і прафэсыянальным арганізацыям пераключыць работу па перавыбарчай кампаніі на райкі палітычнай і адказнай работы.

Жыцельзэйф.

Ажывіць работу дэлегацкага сходу на абутковай фабрыцы

На нашай фабрыцы жанчын—работніц было нямнога, а усё-жа дэлегацкія сходы і дэлегаткі ў паасобку правялі значную работу. Дэлегаткі прымалі ўдзел у каапэрацыйных і лавачных камісіях, у камсодах, былі членамі гарсавету і інш.

Пры фабрыцы існаваў гурток кройкі і шыцьця, у які былі ўцягнуты жонкі рабочых. У сучасны момант гэту работу трэба ажывіць, бо з колькасным ростам нашай фабрыкі павялічваецца рост работніц розных праслоек. Прышоўшыя на перакваліфікацыю, як моладзь, а таксама і з вёскі, у большасьці выпадкаў нічога ня ведаюць аб грамадзкай рабоце і недаацэньваюць іх магчымы ўдзел у вытворчасьці і правядзеньні культурнай рэвалюцыі ў сваім быту.

Бязсумненна, што пры ажыўленьні работы дэлегацкіх сходаў мы можам атрымаць новыя кадры ва ўдарныя брыгады па цэхах, сьвядомых членаў прафсаюзаў.

З боку жонак рабочых наглядаецца вялікае імкненьне к грамадзкаму жыцьцю, пры вылучэньні іх у розныя грамадзкія арганізацыі, яны апраўдваюць сябе на 100 проц.

Трэба ажывіць работу дэлегацкіх сходаў. Фабкому і цэхпрафбюро трэба зрабіць падлік працуючых жанчын па цэхах, бо адсутнасьць яго перашкаджае арганізацыйнай рабоце, а таксама трэба зрабіць колькасны падлік працуючых на розных зьменах. Работу можна добра наладзіць пры дапамозе цэхячэек, цэхпрафбюро і жаночага актыву з работніц фабрыкі.

Ніхамін.

ПЯРОМ РАБСЕЛЬКОРА

Аздаравіць арцель імя „25-га кастрычніка“

У арцелі інвалідаў імя **«25-га кастрычніка»** часта зрываецца работа з-за дрэннай працдысцыпліны, асабліва з боку мукасеяў. Так 10-га верасьня быў выпадак, калі начная зьмена не магла распачаць працу, бо ня было сеянай мукі, а мукасеі на работу ня вышлі і ў выніку выпечка хлеба была сарвана.

Адміністрацыя і прафарганізацыі ніякіх захадаў да зьнішчэньня гэтага ня прымаюць. Часта бываюць зрывы ў арцелі з прычыны таго, што ў свой час няма сеянай мукі, дроў, солі, расьліннага масла, а таксама пагулы, якія займаюць значнае месца. Неаднаразова прападаў хлеб.

Адміністрацыя ніякіх мер ня прымае, каб зьнішчыць гэтыя хваробныя зьявішчы.

Р.

Ельсон зноў прымазаўся

Аб рознага роду прадзелках прахадзімца **Ельсона** ўжо неаднаразова пісалі ў газэце, але фабком на гэта не рэагаваў. Пад націскам рабочых Ельсон павінен быў пакінуць фабрыку і паехаць у Маскву.

Там ён за пакражу папаў у выпраўдом. Па выхадзе з выпраўдому, ён прыехаў у Віцебск і зноў пачаў працаваць на фабрыцы гнутай мэблі.

Тут ён, як ілжэўдарнік і шкоднік, быў выкінуты з рабочай сям'і.

Але больш цікава тое, што пасьля ўсіх сваіх прыгод Ельсон зноў знаходзіцца на службе ў т-ве «Прыхільнікі дзяцей».

Пракуратура павінна зацікавіцца гэтым афэрыстым.

Дворкін.

Па Савецкаму саюзу

Бальшавіцкае прывітаньне працоўным Казакскай АССР

Алма-Ата. ЦВК Казакскай АССР (Тэлеграма).

Прэзыдыум ЦВК БССР горача вітае рабочых, калгасьнікаў, працоўнае дэкханства і ўсіх працоўных Савецкага Казакстану з дзесяцігодзьдзем Казакскай АССР.

Вялізарныя посьпехі працоўных Казакстану, якія вядуць барацьбу пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі і пры сталым падтрыманьні з боку СССР, за перамогу сацыялізму у надзвычайна цяжкіх умовах сьведчаць аб тым, што перамога сацыялізму, абмінаючы капіталістычную стадыю разьвіцьця, ужо ажыцьцяўляецца.

Ідучы па шляху Леніна, па-бальшавіцку вырашаючы нацыянальнае пытаньне на аснове Інтэрнацыянальнага аб'яднаньня ўсіх працоўных, мы пераможам у барацьбе за сацыялізм.

Няхай жыве Казакская АССР!
Няхай жыве Саюз ССР!
Няхай жыве дыктатура пралетарыяту!
Няхай жыве правадыр працоўных ў барацьбе за сацыялізм—УсеКП(б) і яе ленінскі ЦК!

Старшыня ЦВК БССР **Чарвякоў.**
Вык. абавязкі Сакратара ЦВК БССР **Рагачоўскі**

Толькі камуністычная партыя можа весьці пралетарыят к перамогам

МАСКВА, 7. Група ў 35 чал. з 10-ці капіталістычных краін, састаяўшая з дэлегатаў 5-га кангрэсу «Прафінтэрн», у сваёй дэклярацыі да працоўных усяго сьвету пішуць, што яны зрабілі па СССР паездку на працяцу 25 дзён і наведаліся цэлага шэрагу гарадоў.

«Мы шчасьлівы,—гаворыцца ў дэклярацыі,—заявіць перад тварам працоўных усяго сьвету, што бачылі сваймі вачыма, як пралетарыят Савецкага Саюзу будуе сацыялізм. Толькі дыктатура пралетарыяту, толькі сацыялістычны плян, складзены два гады таму назад і названы «пяцігодкай»—маглі даць такія вынікі. Толькі кампартыя можа весьці пралетарыят праз усе цяжкасьці да перамог.

За пабойства рабкора

ЛУГАНСК, 7. Два тыдні таму назад хуліганы і прагульшчыкі Чуханаў, Каткоў, Чыхмароў, Сухамлінаў і Грыгор'еў пабілі рабкора «Луганскай Праўды» і «Камсамольскай Праўды», актыўнага прыкладнага рабочага сілосекальнага заводу т. Радчэнку. Выязной сэсіяй Чуханаў і Каткоў прыгавораны на пяць год, а астатнія—на 3 гады кожны.

Растлумачэньне НКФ СССР

Паводле зьвестак НКФ СССР, у некаторых раёнах сялянскія гаспадаркі, маючыя прыбытак ад гужавых перавозак, няправільна абкладаюцца сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку. У сувязі з гэтым, НКФ СССР растлумачвае, што прыбыткі ад гужавых перавозак, без ужываньня наёмнай працы, ня могуць служыць асновай для аднясеньня сельскіх гаспадарак да кулацкіх і абкладвацца сельгаспадаткам у індывідуальным парадку. Гэтыя прыбыткі павінны абкладацца сельгаспадаткам аднолькава з працоўнымі, саматужна рамеснымі заробкамі, з абавязковым вучотам усіх устаноўленых прыбыткаў і выдаткаў.

Новы гатунак скурсыравіны

ЛЕНІНГРАД, 6. На скурзаводзе «Камінтэрн» скончаны вопыты па скарыстаньню скуры трэскі. Вопыты паказалі, што скура гэтых рыб па сваёй якасьці можа ісьці на выраб розных скураных тавараў і прыгожага абутку. У сувязі з гэтым на заводзе «Камінтэрн» пастаноўлена арганізаваць цэх па вырабу рыбных скур. Цэх будзе прапускаць да 5 тыс. тон у год.

У СССР прыяжджаюць нямецкія і швайцарскія архітэктары

МАСКВА. 6. 10 кастрычніка ў Маскву прыяжджае вядомы нямецкі архітэктар г. Май, які запрошан на пяць год для кіраўніцтва будаўніцтвам новых гарадоў і пасёлкаў у СССР. Сумесна з ім прыяжджае вядомы швайцарскі архітэктар г. Крыг і іншыя спэцыялісты. Шмат буржуазных газэт выказваюць жаль, што ня былі прыняты меры да ўтрыманьня славутых архітэктароў ад паездкі ў СССР.

З-за мяжы прыбываюць трактары

МАСКВА, 7. У бліжэйшыя месяцы пачнуць прыбываць у СССР імпортныя трактары, купленыя для надыходзячае вясеньняе пасяўное кампаніі.

Знойдзен каштоўны архіў

МАСКВА, 6. Знойдзен архіў цыркавой і эстраднай справы за 100 год, маючы вялікае мастацка-гістарычнае значэньне. У архіве маецца багатая літаратура аб першых шляхох цырку і эстрады, газэты, фотаздымкі і г. д. Па пастанове калегіі НКАсьветы, увесь архіў перадан ЦУДЦ'у.

Сьмерць члена прэзыдыуму ЦВК СССР тав. Агамлы-Аглы-Самед-ага

МАСКВА, 6. Прэзыдыум ЦВК СССР з глыбокім жалем паведамляе аб сьмерці 6-га кастрычніка члена прэзыдыуму ЦВК СССР тав. Агамлы-Аглы-Самедага

Сьледуйце прыкладу

МАСКВА, 7. Калгас «По пути Ильича» Паўночна-Каўкаскага краю выканаў гадавы плян хлебазагатовак на 104,4 проц. і поўнасьцю ўнёс прылічваючыйся з яго адзіны сельска-гаспадарчы падатак. Апроч таго, калгасам поўнасьцю выкананы заданьні па пашырэньню пазыкі «Пяцігодка ў чатыры гады», восеннай сяўбе, хлебазагатоўках і інш.

Дзесяцідзёньнік па ўборцы гародніны

МАСКВА. Усе ЦСПС, ЦК ЛКСМ і Цэнтрасаюз прапанавалі ўсім крайпрафсаветам, абкомам ЛКСМ і крайспажыўсаюзам абвясьціць ударны дзесяцідзёньнік па ўборцы гародніны. 10-дзёньнік трэба праводзіць пад лёзунгам «ніводнага цэнтнера няўбранай гародніны».

Расправа польскага фашызму над комдэпутатамі

Тт. Жарскі і Райх прыгавораны на восем год катаржнае турмы

ВАРШАВА, 6. На судовым працэсе тт. Райха і Жарскага, якія абвінавачваліся ў тым, што зьяўляюцца членамі ЦК КП Польшчы, перад сканчэньнем сьледзтва т. Жарскаму было дадзена слова для заявы. У сваёй прамове т. Жарскі падкрэсьліў, што ён зьяўляўся камуністым на працягу ўсёй сваёй работы да выбараў у сойм і ў самім сойме ў якасьці дэпутата і ніколі не хаваўся сваіх поглядаў.

— Мы, —кажа т. Жарскі,—паказвалі масам, што фашысцкі ўрад будзе скінут толькі ўзброеным паўстаньнем мас.

Пасьля спрэчак бакоў вынесен прыгавар. Тт. Жарскі і Райх прысуджаны на восем год катаржнай турмы кожны.

Некалькі дзён таму назад т. Жарскі быў прыгаворан на восем год турмы па другой справе ў Лодзі.

Рабочыя паміраюць з голаду

НЬЮ ЁРК, 23. Некалькі сотняў беспрацоўных гарнякоў у Новай Шатландыі (правінцыя ў Канадзе) літаральна паміраюць з голаду. Нават дзяржаўны «дасьледчы» пасланы канадзкім урадам у Кейп Брэтон (Новая Шатландыя), прымушан прызнаць, што шмат сем'яў беспрацоўных гарнякоў харчуюцца адным толькі хлебам і то ў вельмі недастатковай колькасьці.

Паліцыя справакавала крывавыя сутычкі

БЭРЛІН, 6. У лейпцыгскім працэсе членаў нямецкага КСМ, прыцягнутых да судовай адказнасьці ў сувязі з крывавымі сутычкамі ў часе камсамольскага зьлёту ў Лейпцыгу ў красавіку 1930 г., працягваецца допыт сьведкаў паліцэйскіх. Гэтыя паказаньні поўнасьцю сьцьвярджаюць, што крывавыя сутычкі паміж паліцыяй і ўдзельнікамі зьлёту **былі выкліканы паліцэйскай правакацыяй.** Шэраг паліцэйскіх сьведкаў таксама заявілі, што дэманстранты вялі сябе спакойна. Паліцэйскі афіцэр Гальле, выстраіўшы паліцэйскіх, загадаў ім прыгатаваць свае рэвальверы. Сьведкі паказалі, што гэтае распараджэньне Гальле абурыла дэманстрантаў.

На вячэрнім паседжаньні суду камсамольцы заявілі пратэст супроць гвалтаў, якім яны падвергліся з боку паліцыі. Абарона патрабавала высьвятленьня гэтага факту шляхам выкліку сьведкаў.

Перагаворы нямецкага ўраду з фашыстымі

БЭРЛІН, 6. «Ротэ Фана» паведамляе, што перагаворы паміж рэйхсканцлерам Брунінгам і кіраўніком нацыянал-сацыялістычнай (фашысцкай) партыі Нямеччыны Гітлерам па пытаньню аб правядзеньні эканамічнай і фінансавай праграмы ўраду яшчэ ня скончыліся. За падтрыманьне ўраду ў правядзеньні гэтай праграмы і абработку ў гэтым напрамку шырокіх працоўных мас Нямеччыны, фашыстыя патрабуюць роспуску прускага ландтагу і прадастаўленьня ім партфэляў міністра ўнутраных спраў і ваеннага міністра. Супроць самой урадавай праграмы Гітлер ня мае ніякіх супярэчнасьцяў.

Скарачаюць зарплату ў зьвязку з скарачэньнем рабочага дню

БЭРЛІН, 6. Адміністрацыя буйнейшага хэмічнага прадпрыемства Нямеччыны «Лейна» увяла скарочаны рабочы дзень з адпаведнай паніжанай зарплатай для 4800 рабочых. Зарплата кожнага рабочага паменшыцца ў сярэднім на 8—10 марак у тыдзень. Члены заўкому ад рэвалюцыйнай прафапазіцыі выставілі патрабаваньні аб скарачэньні рабочага дню з захаваньнем поўнай зарплаты.

Разгром фашыстымі рэдакцыі

РЫМ, 7. У ваколіцы Гарыцыі невядома кім забіт італьянец, стары фашысты Вірго Лаатуцца. У зьвязку з гэтым—мясцовыя фашыстыя разгромілі ў Гарыцыі рэдакцыю славенскае газэты.

Узмацніць абслугоўваньне прызыўніка

Недастаткова разгорнута работа

Работа прызыўнога пункту ў горадзе Віцебску і падкамісіі Віцебскага раёну праходзіць добра. Дапрызыўнікі зьяўляюцца акуратна за выключэньнем сельсаветаў Віцебскага раёну. Уважліва падыходзяць да прызыўнікоў. Адсейваецца чужы клясавы элемэнт. Падбіраюцца лепшыя ў Чырвоную армію.

Тут-жа недалёка ад пункту працуе агіткуток. Добра абсталяван куток МОПР'у, дзе паразьвешана багата малюнкаў, якія адбіваюць рэвалюцыйную барацьбу за межамі. Тут-жа недалёка цір, дзе з дробна-калібэрных вінтовак вучацца страляць тыя, хто неўзабаве будзе моцна трымаць вінтоўку, стоячы на абароне мяжы Савецкага Саюзу.

Адмоўны бок тое, што позьняцца або зусім ня прыходзяць юрыстыя для юрыдычнай кансультацыі. А пытаньняў у прызыўнікоў шмат, іх некаму тут растлумачыць. Праўда, багата ўвагі гэтым пытаньням аддае прапагандысты пры агіткутку, але куды лепш было-б, каб быў юрысты. Пракуратуры трэба аб гэтым паклапаціцца і выправіць хоць напасьледак гэтую памылку.

Трэба адзначыць недастаткова разгорнутую работу сярод прызыўнікоў Віцебскага раёну. Да рэчы сказаць, што дагэтуль камсамол ня склікаў канфэрэнцыю прызыўнікоў.

Прызыў неўзабаве скончыцца. Партыйным і прафсаюзным арганізацыям трэба ўзмацніць работу сярод прызыўнікоў з тым, каб лепш закончыць адбор, каб паслаць у Чырвоную армію клясава вытрыманае папаўненьне.

Шмуляўцаў.

Ідзе новае папаўненьне

(На прызыўным пункце)

Поўдзень. Работае камісія па адборы ў Чырвоную армію. Лепшых, здаровых, адбірае яна тых, хто па кутках Віцебшчыны будуе калгасы, поўніць іх, ламае старыя шулы жыцьця вёскі і сваёй моладасьцю, бадзёрасьцю кліча наперад раскіданую па хутарох вясковую масу.

Цяпер яны зьяўляюцца на прызыўны пункт. Няма спазьненьняў, няма крыку, няма п'яных. Сур'ёзныя, спакойныя яны распранаюцца і перад камісіяй мільгаюць здаровыя, моцныя мускулы, крыху атуленыя загарам.

Устае доктар, уважліва слухае сэрца, лёгкія і гэты жыхар гораду дзівіцца перад сілай, моладасьцю.

— У вас,—кажа доктар,—

— Што ў мяне, — ухмыляючыся пытаецца хлапец.

— Рука нешта, ось тут прыпухла крыху,—і доктар азіраючыся кідае погляд на астатніх членаў камісіі.

Тыя падыходзяць, пільна ўглядаюцца, нешта гавораць.

На твары хлапца засмучонасьць, ён рухліва падыходзіць да доктара.

— Зваліўся калісьці з возу,—кажа ён,—дык крыху руку сапсаваў, але цяпер загаілася. Во яна,—зьгінае ён руку, напружваючы мускулы, дзе відаць сіла, спрытнасьць.

— Годзен,—кажа камісія і прызыўнік весела ўхмыляючыся адыходзіць да тых, што сядзяць там на ўслонах, вокнах, абпёршыся аб сьценку, чакаючы сваёй чаргі.

Да стала падыходзіць другі, тав. Агафонаў. Крыху слабейшы, але вочы гараць агнявістасьцю, упартасьцю.

Яго доўга слухаюць, аглядаюць. Нешта гутараць.

— Лёгкія ў вас слабыя, - кажа дохтар.

— Нічога,—адказвае ён,—там заживуць. Хачу ў Чырвоную армію,—рашуча заяўляе т. Агафонаў.

Ён адыходзіць. За ім другі, трэці. Багата іх. Сыры, сьвежы, але здаровы матар'ял. Іх цікавіць жыцьцё Чырвонай арміі, куды нясуць яны сваю сілу, здароўе і выходзяць адтуль яшчэ больш узмацнёныя, загартаваныя на лепшае правядзеньне калектывізацыі вёскі, за яшчэ большае і хутчэйшае выкананьне пяцігодкі на заводзе.

Яны адмаўляюцца ад прадастаўляемых ім ільгот. Так, т. Зысін адмовіўся ад ільготы 1-га разраду. Усе яны рашуча заяўляюць аб сваёй гатоўнасьці ісьці ў Чырвоную армію, аб сваёй гатоўнасьці, жаданьні разам з рабочай клясай пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будаваць сацыялізм.

Іх многа. Яны перамогуць.

Шопытны Вір.

Бюракраты зрываюць пачаток навучальнага году ў ФЗВ

Пачаўшаеся камплектаваньне падлёткаў у школы ФЗВ канчаецца. І трэ' было-б спадзявацца, што ўсе 17 школ ФЗВ і прафтэхшколы пачнуць сваю работу але гэта далёка ня так.

Камплектаваньне школ ФЗВ фабрыкі **«Дзьвіна»** і школы кулінараў было зроблена без патрэбнага разьмеркаваньня і растлумачэньня, у выніку чаго ў гэтых школах пачаўся вялікі адліў і нельга пачынаць заняткі.

Згодна дырэктыў Наркамасьветы і іншых устаноў, у гэтым годзе ў ФЗВ павінна быць прынята 15 проц. былых бяспрытульных, а ў віцебскія ФЗВ прынята ўсяго 85 бяспрытульных, што складае 12 проц. Таксама мала прынята і дзяцей сялян—усяго 41 чал., за тое служачых камісія пры бюро кадраў прыняла 61 чалавек. Былым бяспрытульным не прадаставілі інтэрнатаў і зараз яны тулюцца на вуліцы.

Перад пачаткам навучальнага году ў школах ФЗВ стварылася пагроза частковага зрыву заняткаў. Шмат фабзавучаў не забясьпечаны спэцыяльнымі падручнікамі, асабліва па прадметах тэхналёгіі мэталю, машынамі і г. д. Раней ніхто не клапаціўся аб тым, каб забясьпечыць школы неабходнай літаратурай і зараз зрываюцца заняткі ў ФЗВ.

Ня ўсе школы ФЗВ забясьпечаны праграмамі, выпрацаванымі Наркамасьветы і іншымі асьветнымі ўстановамі. Такім чынам, заняткі ў школах пачнуцца без праграм.

У Віцебску павінна адчыніцца школа электраманцёраў на яўрэйскай мове, але школа дагэтуль не ўкамплектавана.

Шэраг прафтэхшкол і ФЗВ не забясьпечаны інтэрнатамі.

З-за няўвязак паміж адпаведнымі ўстановамі і бюракратычных адносін да ўкамплектаваньня фабзавучаў—стварэцца пагроза несваячасовага пачатку вучобы. Напрыклад, адміністрацыя школы ФЗВ **памчошнай** ф-кі «Клары Цэткін» закрыла дзьверы для дзяцей рабочых, нараджэньня 1915 г. Наадварот у школу ФЗВ будаўнікоў было прынята 53 падлёткаў 1915 г. нараджэньня.

С. Фейгінзон.

Навіны навукі і тэхнікі

Новы спосаб кансэрвацыі хутка псуючыхся прадуктаў

У Амэрыцы, у харчовай прамысловасьці набыў шырокае ўжываньне новы спосаб захаваньня хуткапсуючыхся прадуктаў. Гэта «квікфрызінг»—хуткае замарожваньне. Вынаходца гэтага спосаба Клерэнс Бэрдсай натрапіў на яго зусім выпадкова. Калі некалькі год таму назад ён быў у Амэрыцы, ён заўважыў, што рыбы, замёрзшыя на сораказрадусным марозе, аджывалі ў цёплым пакоі. Гэта пярэчыць штодзённаму вопыту, які кажа, што замёрзшыя арганізмы гінуць з прычыны таго, што крышталы лёду разрываюць жывыя тканіні. Справа, такім чынам, у хуткім замярзаньні. Чым больш гэтая хуткасьць, тым больш дробнымі атрымліваюцца крышталы і тым менш шкоды прыносіць замарожваньне тканям. Асаблівасьць «квікфрызінга» у тым, што прадукты цалком захоўваюць уласьлівы ім пах, смак, вітаміны, словам, усю сваю пажыўную каштоўнасьць. Хутка замарожаныя прадукты прадаюцца ў стандартнай упакоўцы з празрыстага цэлюлёіда. «Квікфрызінгу» паддаюцца ўсе віды мяса, дзічы, зелені, гародніны. Нават суніца і памеранцавы сок могуць захоўвацца на значна долгі час. Такім чынам, спажывец ва ўсялякі пэрыяд году будзе мець зусім сьвежы натуральны прадукт. «Квікфрызінг» стварэцца пры дапамозе цьвёрдай углекіслаты, маючай тэмпэратуру ніжэй 100. Вялікай перавагай хутказамарожаных прадуктаў зьяўляецца тое, што яны не патрабуюць спэцыяльных вагонаў і халадзільнікаў для перавозкі. Ролю халадзільніка выконвае вялікі запас холаду, што знаходзіцца ў саміх прадуктах. Шчыльна укладзеныя і заключаныя ў няцёплаправодную абалочку, прадукты «квікфрызінгу» лёгка выносяць сямідзённую перавозку па чыгунцы.

Адбылася гарадзкая канфэрэнцыя саюзу бязбожнікаў

У канцы верасьня адбылася 1-я гарадзкая канфэрэнцыя саюзу ваяўнічых бязбожнікаў г. Віцебску. Канфэрэнцыя заслухала даклад т. Шчуцкага аб чарговых задачах антырэлігійнае прапаганды і задачах гарадзкой арганізацыі СВБ і прыняла шэраг канкрэтных мерапрыемстваў па разгортваньню антырэлігійнае работы ў горадзе на зімовы час.

Канфэрэнцыяй абран гарадзкі савет СВБ у колькасьці 23 членаў і 5 кандыдатаў і рэўкамісія з 5 членаў і 2 кандыдатаў.

Адбыўшыйся пленум гарсавету СВБ абраў прэзыдыум гарсавету з 9 членаў і 2 кандыдатаў.

Старшынёй гарсавету СВБ абран т. Шчуцкі, адказным сэкратаром—т. Галубцоў.

Вігрупном друкароў запавяшчае, што сеньня, 8-га кастрычніка, а 5 гадз. увеч., у клюбе «Прафінтэрн», адбудзецца

АГУЛЬНЫ СХОД РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ сумесна з жонкамі

АБВЕСТКА ДНЮ:
1) Даклад т. Ханіна аб выкананьні прамфінпляна.
2) Справаздача дэлегатак.
3) Выбары дэлегатак.
Пасьля схода—**мастацкая частка.**

Упарадкаваць жыльлёвыя няўрадзіцы

ДА АДКАЗНАСЬЦІ ДАМАЎЛАСЬНІКАЎ, ЯКІЯ ЗЬДЗЕКВАЮЦЦА НАД РАБОЧЫМІ ЖЫЛЬЦАМІ

Сарвалі арганізацыю сталовай

Камісіі пры жакце № 6 даручана было арганізаваць сталовую ў жакце. Доўга працавала камісія, падрыхтоўваючы матар'ялы, а калі паўстала пытаньне аб памяшканьні, старшыня праўленьня жакту Платоненка пашоў проці арганізацыі.

— Навошта нам сталовая,— агітуе Платоненка сярод жыхароў. Пры жакце № 3,—кажа ён,—арганізавалі сталовую і сталі даваць посныя абеды. Давайце лепш паставім так, каб давалі нам замест абедаў 100 грам мяса.

Арганізацыя сталовай, такім чынам, была сарвана.

Свой.

Трэба расьсьледваць!

Жакт № 3 па Сьцякольнай вуліцы. Багата накоўг сьветлых, чыстых. Там недзе пад домам прытуліўся невялічкі гнілы склепок.

З двох бакоў ён засыпан зямлёй. Адно вакно—ў роў, другое ў калідор. Ні сьвету, ні паветра, цёмна, няпрытульна ў склепе. Жыве тут работніца фабрыкі «Прафінтэрн» № 1 тав. Бараноўская. Не адзін раз прасіла яна праўленьне жакту аб прадастаўленьні ёй лепшай кватэры, каб пасьля работы хоць адпачыць як чалавеку.

Жакт маўчыць. У яго няма для работніцы вольнае чыстае кватэры, бо тыя, што аслабяноюцца, зараз-жа аддаюцца другім. Нядаўна жакт, аглядзючы кватэры, цавялічыў плату і на гэты склеп, як нармальную кватэру.

Бараноўская запратэставала. Праўленьне жакту выклікала тэхніка, які, зьявіўшыся ў падвал і ледзь адшукаўшы Бараноўскую ў пакоі, вызначыў, што вакно не ў зямлі, сьвету давол. А што дзьве сьцяны засыпаны зямлёй і вільгаць на сьцянах, дык тут ніхто не вінават. Він ват той, хто калісьці будаваў гэты дом.

Хто пакажа жакту на яго недапусьцімыя паводзіны?

І.

Старшыня дапамагае

Былая буйная ўласьніца рэстарану ў Дзьвінску, а пасьля 1918 г. і—у Віцебску—Лапідус нейкім чынам дабілася таго, што страхкаса плаціць ёй пэнсію, як інвалідцы працы.

У той час, калі пытаньне з жыльплошчай на сёньняшні дзень вельмі вострае, Лапідус займае на 3-х чал. два вялізарных пакоі ў жакце № 11, д. 10, тады, калі ў гэтым-жа доме рабочыя туляцца ў маленечкіх прахадных пакоях. Мала таго, старшыня рэўкамісіі тав. Міндлін на паседжаньні праўленьня ўносіць прапанову, каб зрабіць рамонт на кватэры Лапідус, каб «ёй спакойней было жыць».

Жактавец.

Паберажэце дзіця

Доўга аббіваў гр н Пятухоў парогі жылстала ў Гарсавеце. Доўга туляўся ён па кутках у знаёмых, покі ўрэшце не дастаў сабе невялічкі пакой, па Савецкай, 15. Пятухоў рад, ён цяпер будзе жыць як чалавек, будзе мець свой куток і ня будзе дакучаць знаёмым і мучыць сям'ю.

Так думаў ён, калі пераходзіў на гэтую кватэру, а перабраўшыся, ён убачыў, што разам з ім жыве за перагародкай хворы на сухоты, якому дактарамі забаронена жыць сумесна з кім небудзь.

Пятухоў у роспачы. У яго маленькая дзяўчынка, ды яшчэ слабая, ці доўга-ж ёй захварэць?

Дарэмна ён бегае ў праўленьне жакту. Дарэмна крычыць і просіць даць дзе-небудзь хоць дрэньненькі пакой, Праўленьне нема маўчыць.

— Хворы яшчэ ходзіць,—кажуць праўленцы,—нічога страшнага няма.

Спынеце вьдзекі над Пятуховым, забясьпечце дзіця ад хваробы.

Сакалінец.

Супакойце Зіскіна

К заг. жылсталом пры гарсавеце тав. Зіскіну «прыехала з Вяліжа стрыечная сястра. Ён патрабавалася кватэра. З поваду таго, што вольная кватэры для сястры не аказалася, Зіскін даведаўшыся аб тым, што ў жакце № 6 ёсьць вольны пакой, долга ня думаючы прыходзіць да тав. Вульфсон (гаспадара кватэры) з патрабаваньнем прадаставіць прыехаўшай сястры кватэру. Калі тав. Вульфсон адмовілася даць кватэру без дазволу праўленьня, Зіскін разлаваўся.

— Пяць чалавек усялю,—крычаў ён,—калі ня хочаце прыняць аднаго.

Б.

Выявіць твар Сьмірагіна

Па 2-му Елагскаму зав. д. № 20, пражывае нехта Сьмірагін А., які, арандуючы дом за 4 рублі, спэкулюе жыльплошчай. Адначасова па Пясочнай вул. № 15 Сьмірагін мае ўласны дом, які таксама аддае ў арэнду.

Калі кватэрант стаў плаціць Сьмірагіну па стаўцы, апош і абурыўся, ня стаў браць грошы і ўсяляк стараецца выжыць яго з кватэры.

Дарэчы сказаць, Сьмірагін, будучы зьнятым з работы інструктара фізкультуры, у зьвязку з антысэмітызмам, прыстроіўся касірам на чыгунцы

Грамадзкасьць павінна зацікавіцца асобай Сьмірагіна.

Аса.

Газэта дапамагла

— Заметка пад загалоўкам «Неабходны тэрміновыя меры» падцьвердзілася і вінаватыя прыцягнуты да адказнасьці па 196 арт. КК.

— Заметка пад загалоўкам «Патрабуем умяшацельства РСІ і пракуратуры» падцьвердзілася, і гр-н Розенбаум прыцягнут да крымінальнай адказнасьці па 196 арт. КК.

— Заметка пад загалоўкам «Да адказнасьці за зрыў падрыхтоўкі» цацьвярдзілася і гр-не Л. Лондан і Мураўскі прыцягнуты да крымінальнай адказнасьці па 196 арт. КК.

— Заметка пад загалоўкам «У саюзтрансе зажалі самакрытыку» падцьвердзілася і гр-ка Сакалова і інш. прыцягнуты да судовай адказнасьці па 196 арт. КК.

— Заметка пад загалоўкам «Дзе санітарнае вока» падцьвердзілася і гр-ка Плевака, старшая паварыха, за нядбайнасьць зьнята з працы.

Гарадзкая пракуратура паведамляе што заметка, зьмешчаная ў газэце «Віцебскі Пралетары» пад загалоўкам «Масавыя прастоі на фабрыцы імя Лекерта» падцьвердзілася. Справа па абв. гр. гр. Ізраэліт і Шэнчанкі пасланы ў нарсуд.

Час. вык. аб. адк. рэдактара Ул. Дуброўскі.

Да ўсіх членаў і кандыдатаў Гарсавету

Зараз па гораду ідзе кампанія па давыбарах у Гарсавет. Праца Гарсавету на працягу амаль усяго часу слаба асьвятлялася ў друку. Рэдакцыя газэты «Віцебскі Пралетары» зварочваецца да ўсіх членаў і кандыдатаў Гарсавету асьвятляць у газэце працу Гарсавета і яго сэкцый, а таксама і ход правядзеньня давыбараў.

Культмасавы сэктар газэты «Віцебскі Пралетары»

Арганізацыя фотарабкораўскага гуртка

З 6-га кастрычніка пры рэдакцыі газэты «Віцебскі Пралетары» пачаў функцыяніраваць **фотарабкораўскі гурток.**

Усе рабкоры, жадаючыя займацца, павінны з а п і с а ц ц а ў масавым сэктары рэдакцыі.

Масавы сэктар.

Да ведама рабкораў, ад'яжджаючых на выстаўку

Усе рабкоры, вылучаныя ФЗМК і рэдкалегіямі для паездкі на Усебеларускую сельска-гаспадарчую выстаўку, павінны 10-га кастрычніка, а 9-й гадзіне раніцы, зьявіцца ў рэдакцыю для паездкі ў Менск.

Культмасавы сэктар.

— У чацьвер, 9-га кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары, у доме асьветы адбудзецца чарговы пленум **сэкцыі нарасьветы** з наступнай абвесткай дню:

1) Даклад гаркому ЛКСМ аб культэстафэце.

2) Вынікі камплектаваньня школ і прафасьветных устаноў.

3) Аб правядзеньні праверкі ўсеагульнага абавязковага навучаньня.

Яўка ўсіх членаў сэкцыі і загадчыкаў школ абавязкова.

— У чацьвер, 9-га кастрычніка, а 6½ гадзін увечары, у памяшканьні гарсавету, пакой № 22, склікаецца аб'яднаны пленум **сэкцый працы і забясьпекі і РСІ** з абвесткай дню: 1) справаздача страхкасы, 2) садаклад камісіі.

Яўка ўсіх членаў сэкцый, дэлегатак і прымацаваных абавязкова.

Там-жа, а 6-й гадзіне ўвечары, адбудзецца бюро гэтых сэкцый.

— **Ваенная сэкцыя** Гарсавету ў другі раз назначае пленум сэкцыі на 9 к а с т р ы ч н і к а а, 6-й гадз. увечары, у памяшк. Гарсавету, пакой № 44.

Незьявіўшыеся будуць лічыцца як выбыўшыя і перададзены ў мандатную камісію.

Усім піанэрам і школьнікам

13-га кастрычніка, а 6-й гадз. увечары, у памяшканьні Белдзяржтэатру адбудзецца паказ **«Мост»** для піанэраў і школьнікаў, у сувязі з сустрэчай 3-х гарадоў—Магілеў, Ворша і Гомель. Усім атрадам і школам трэба загатовіць білеты.

Білеты па зьмяншоных цэнах будуць прадавацца ў гарбюро ДКА.

Апошні тэрмін здачы авантаў

Праўленьне ЦРК паведамляе ўсе фабзаўкомы і каапупаўнаважаных аб тым, што 10 кастрычніка гранічны тэрмін здачы авансаў на тавары.

Пагэтаму да 6 гадз. увечары 10-га кастрычніка павінны быць канчаткова зроблены ўсе разрахункі з ЦРК і прадстаўлен канчатковы спіс тавараў, на якія атрыманы авансы.

Пасьля гэтага тэрміну прыём авансаў спыняецца і тавары будуць перададзены іншым прадпрыемствам.

Аб дні выдачы ордэраў будзе аб'яўлена асобна.

Клюб „МЭДПРАЦАЎНІК"

Сеньня, 8-га кастрычніка, а 8 гадз. увеч., адбудзецца ўрачысты **вечар** **провадаў дэмабілізаваных чырвонаармейцаў у доўгатэрміновы адпачынак (нашай падшэфнай часткі).**

Праграма вечара:
1) Урачыстая частка.
2) Раздача падарункаў.
3) Мастацкая частка (выступленьне артыстых).

Просьба зьяўляцца своячасова без спазьненьня сябрам саюзу мэдсанпрацы і падшэфнай часткі.

Уваход для членаў саюзу па саюзбілетам.

Праўленьне.

1553—2—2

— **Сёньня, 8-га кастрычніка,** а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні чырвонага кутка **адбудзецца агульны сход** хатніх работніц 1-га і 2-га раёну.

Наймальнікі абавязаны адпусьціць хатніх работніц к указанаму тэрміну.

— Віцебская Біржа працы (сэкцыя падлёткаў) паведамляе ўсіх беспрацоўных і састаячых на вучоце Біржы працы падлёткаў аб тым, што 10-га кастрычніка, у 4 гадзіны дню, у памяшканьні сэкцыі падлёткаў назначаецца агульны сход усіх беспрацоўных падлёткаў па пытаньню пасылцы на работу.

Незьявіўшыяся на сход будуць лічыцца не адзначанымі за кастрычнік.

— Віцебская Біржа працы (сэкцыя будаўнікоў) паведамляе падаўшых заявы для паступленьня на курсы ЦІП'а аб тым, што сёньня, 8-га кастрычніка, у 4 гадзіны дня, неабходна зьявіцца ў сэкцыю для пасылкі на мэдагляд.

Сход пайнікаў ЦРК

9 га кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары, у клюбе «Парыскай Камуны» у малой залі адбудзецца агульны сход пайнікаў ЦРК, сумесна з хатнімі гаспадынямі жактаў №№ 9, 10 і 11 і пайнікаў, пражываючых ў гэтым раёне ня ў жактах.

Абвестка дню:
1) Аб прымацаваньні пайнікаў ЦРК к магазынам.
2) Бягучыя справы.

Сход інжынэрна-тэхнічных работнікаў

Сёньня, а 6-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Палацы працы, пакой № 11, склікаецца агульны сход інжынэрна-тэхнічных работнікаў гораду.

На сходзе павінны прысутнічаць усе старшыні ФЗМК і цэхкамітэтаў.

Абвестка дню:
1) Справаздача ГарМБІТ.
2) Аб перавыбарах сетцы ІТР.
3) Аб вытворчых манэўрах.

— Віцебскі Белпэдтэхнікум паведамляе, што прыём заяў на 1-ы курс Белпэдтэхнікуму працягнут да 15-га кастрычніка.

— Па пытаньню зьместу і пляну мэтадычнай працы склікаюцца наступныя настаўніцкія вытворчыя аб'яднаньні:

9-га кастрычніка, а 7½ г.—групаводы 4 груп, дакладчык—вылучаная камісія.

11-га, а 6 г.—групаводы 1 груп: 1) дакладчык—бюро аб'ядн., 2) «навучаньне грамаце»—т. Каліноўскі.

11-га а 8 г.—выкладчыкі фізмат. дакл. Собаль, Абрамовіч, Салоха.

12-га, а 6 г.—групаводы 2 груп, дакладчык—т. Няразік.

12-га, а 8 г.—выкладчыкі прыродазнаўства, дакл. Ціханаў і Крывашэя.

14-га, а 8 г.—выкл. мовы і літаратуры сацвыху, палітасьветы прафшкол і ФЗУ, дакладчыкі—Арлоўскі і Піліпаў.

Незьявіўшыяся тт. павінны будуць даць **тлумачэньне аб прычынах сваёй адсутнасьці**

ЦЫРК т-ва „Прыхільнікі дзяцей".

Прыяжджае японскі вядомы артысты ІСА ТАНІ (сапраўдны)

1-ы БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
Сёньня, 8-га кастрычніка, для групкому нархарч № 1. Заўтра, у чацьвер, 9 кастрыч., для саюзу мэдыкапрацы,
МОСТ
Пачатак роўна а 8 гадзін увечары.
Бялеты—ў касе тэатра

СЁНЬНЯ, СЕРАДА, 8 кастрычніка
ЦЫРК (т-ва „Прыхільнікі дзяцей")
ЗАЎТРА, ЧАЦЬВЕР, 9 кастрычніка
НОВАЯ ПРАГРАМА:
4 Цасгей, 3 Чайчэнка, клёўн Том, І. Буякоўская, Мар'я і Аляксандр Шырай, Н. П. Зініч і Поль Эрліх, Жан і Алекс, Буранжэ і ўся труппа.
1-я гастроль Ісатані, 1-я гастроль Стаўро, 3 Кірос, Мар'я і Алякс. Шырай, 4 Цасгэй, 3 Чайчанка, Н. П. Зініч і Поль Эрліх і ўсе атрацыёны.
Канфэрансье Лебедзеў (дзядзька Ваня).
АНОНС! На гэтых днях МАРАГАШ І РЫНГЛЕР.

Гартэатр. ГАСТРОЛІ МУЗЫЧНАЙ КАМЭДЫІ пад кіраўніцтвам Б.В. Бэнэдыктава.
Сёньня, 8-га кастрычніка, БЕЛАЯ МОЛЬ у 3-х дзеях Ленскага.
Заўтра, у чацьвер, 9, і пятніца, 10 кастрычніка, Чорны амулет у 3 дзеях, муз. Стрэльнікава.
Бялеты—ў касе тэатра. Пачатак роўна а 8 гадз. увеч.

БЕЛДЗЯРЖКІНО 3 пан'ядзелка, 6-га кастрычніка
СПАРТАК Пачатак 1-га сэан. а 6г. 30хв. Цьверды характар мастацкі фільм.
МАСТАЦКІ Штодзённа 4 сэансы, Пач. 1 сэан. а 6г. Новы замежны фільм вытвор. Лео-фільм КАХАНЬНЕ МАРАКА драма ў 7 част.
ПРАЛЕТКІНО Пач. 1-га сэансу роўна а 6 гадзін. Нашум. карціна з цыркавога жыцьця СЬМЯРОТНАЯ ПЯТЛЯ ў 8-мі частках.

Даводзіцца да ведама, што бюро урачэбнай экспэртызы з 10-га ліку г. м. будзе працаваць па пяціднёўцы. Выхадн. дні будуць: 5, 10, 15, 20, 25 і 30 кожнага месяца. У паказаныя дні бюро урачэбнай экспэртызы будзе зачынена.
1558—1—1 Бюро урачэбнай экспэртызы.

6-му отдельному производителю работ ГЛАВДОРТРАНСА ТРЕБУЮТСЯ ЖИЛЫЕ ДОМА свободные от жильцов в черте города.
С предложениями продажи обращаться в контору работ постройки Луческого моста. Телефон 5-18. Почтовый адрес: Витебск, вокзал, Прорабу 6.
1552—6—2

Утерян бумажник с документами на имя Маймина Леонида Савельевича; нашедшего просят доставить за вознаграждение в столовую № 8 (Пушкинская улица прот. «Пролеткино») или сообщить по телефону 5-74.
1560—1—1

ПРОДАЕТСЯ —) дубовый (— ПИСЬМЕННЫЙ СТОЛ Луческая, 30. 1559—2—1

Згублены і ўкрадзены ніжэйпаказаныя дакументы, якія лічыць несапраўднымі:

Паявая кніжка Вігдэргауз 207
Паявая кніжка Ф. Аўсіевіч 208
Паявая кніжка П. Калымага 209
Паяв. кніжка Ермашкевіч М. 210
Конская картка Маханькова С. 211
Вайсковы білет Турак П. 212
Вайсковы білет Лебедзева П. 213
Асабіст. картка Скакун Ів 214
Чл. біл. саюзу рабзямл. і паяв. кн. Шурык М. 215
Вайсковы білет Балубнева І. Ф. 481
Пасьведчаньне асабовасьці Пракапенка Н. 482
Білет, выд. Віцебск. рабачкомам нарсуязі за № 165471, Кісялёва С. Я. 483
Паявая кніжка Янавіцкага спаж. т-ва за № 1473 Каланіцкай А.С. 484
Вайсковая кніжка Зазіта В. П. 485
Паявая кніжка янавіцкаго спаж. т-ва за № 675 П. Д. Райковай 461
Пасьведчаньне асабовасьці П. Шалаявай 462
П а я в а я кніжка за № 2594 Д. П. Крузава 463
П а я в а я кніжка за № 533 І. С. Баранава 464
Вайсковы б і л е т А. Шпакоўскага 465
Сяброўская кніжка саюзу будаўнікоў за № 52|252123 С. Ф. Сьмірнова 466
Кніжка Сіроцінскага спаж. т-ва Г. С. Шабрынскага 467
Вайсковы білет В. І. Адынца 468
Вайсковы білет К. М. Авнопа 469
Пашпарт Трафімава М. П. 481
Ваенны білет Блінава Івана 482
Каапэр. кніжка Забела В. Ф. 483
Каапэр. кн Гусакова Г. 484
Каапэр. кн. Бавaленка П. 485
Каапэр. кн Ігнявёнак Ф. 486
Ваенны білет Куклава З. 487
Пашпарт, спраўка аб сацстановішчы і спраўка для прадстаўл. у бальніцу О. Сьцепаненка 488
Паявая кн. № 2863 Шмытава Ф. 489
Паявая кніжка Маруткова Я. 490
Пасьведч. асаб. Вараб'ёва Е. 491
Ваенны білет, дакум. аб разьдзеле Е. Коласава 492
Дзьве пайных кн. Гусакова 493
Вайсковая кніжка, паляўнічы білет і конская кніжка І. Тарабука 401
Каапэр. кніжка за № 3714, выд. Высач. спаж. т-вам, Ганны Жук 402
Сяброўская паявая кніжка за № 716 Х. Фішмана 403
Сяброўская кніжка Чашніцкага спаж. т-ва № 457 М. Яскевіча 404
Дакумант аб сканчэньні сямігодкі І. П. Угневенак 405
Каучукавая пячатка Сураскага лесазаводу 407
Мэтрыка Н. Ф. Дашкевіча 408
Каапэр. кніжка Гарадоцкага спаж. т-ва за № 4117 А. М. Ясенецкага 409
Кніжка Чашніцкага спаж. т-ва № 464 А. І. Папко 410
Саюзная кніжка № 73688 М. Кашчэевай 411
Дзіцячая страх. кніжка на імя Л. І. Карабуцкага 412
Паявая кніжка Бешанкавіцкага каап. «Селянін» В. Бараноўскай 413
Паявая кніжка Бешанкавіцкага спажывецкага т-ва М. Н. Акулёнак 414
Вучот.-конская картка Н. І. Бодзякова 415
Вайсковы білет К. А. Прудніка 416

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.
У пятніцу, 10 кастрычніка,
АДЗІНЫ вечар АПАВЯДАНЬНЯЎ І ПАРОДЫЙ, САТЫРЫ І ЮМОРА Уладзімера ХЕНКІНА,
пры ўдзеле: сьпявачкі Іны Ровіч, артыстага сафіла С. Муравіна (скрыпка). у раяля А. Фінкэльштэйн
Пачатак роўна а 9-й гадзіне ўвечары.
Білеты прадаюцца ў касе тэатру з 12 да 2 гадзін і ад 5 да 10 гадзін увечары, і ў Палацы працы (кніжны кіёск) з 9 гадзін раніцы да 4 гадзін дню.
Па калектыўных заяўках скідка 25 проц.

Віцгарліт № 1. Друкарня «Камінтэрн», Бальшавіцкая, 10.